Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
11 СТУДЗЕНЯ 2017 г. СЕРАДА № 6 (28370)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Малавядомы Канстанцін Заслонаў**
СТАР. 7



**Беларускі народны каляндар на 2017 год**
СТАР. 8–9



**Прычыны сямейных канфліктаў**
СТАР. 11

*ЛІЧБА ДНЯ*

**111,8%**

*склаў індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў 2016 годзе ў параўнанні з 2015-м. Харчовыя тавары ў 2016 годзе падаражэлі на 10,4% у параўнанні з 2015 годам. Цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 9,4%, на паслугі — на 19,7%. Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў снежні 2016 года ў параўнанні з лістападам склаў 100,5%, са снежнем 2015 года — 110,6%.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9640 | ▲ |
| Еўра | 2,0810 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0723 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НАШ АГУЛЬНЫ КЛОПАТ — БЕЛАРУСЬ

## Задача цяперашніх пакаленняў беларусаў — зберагчы краіну і перадаць яе свабоднай і незалежнай тым, хто прыйдзе пасля іх

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў учора на цырымоніі ўручэння прэмій «За духоўнае адраджэнне», спецпрэмій дзеячам культуры і мастацтва і «Беларускі спартыўны Алімп».** СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

**Прэміі «За духоўнае адраджэнне» ўдастоены калектыў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.**




# Халодны студзень 2017-га

### Як перажыць маразы?

**У беларускім «полюсе холаду» — пасёлку Езярышча на крайнім паўночным усходзе Віцебскай вобласці — тэмпература падала да мінус 34 градусаў. Не лепш было і ўдзень — слупок тэрмометра толькі ў панядзелак устойліва пераадолеў адзнаку ў 20 градусаў ніжэй за нуль. У такія халады без печкі ў прыватным доме не абысціся. Ды і жыхары шматпавярховак пачынаюць масава карыстацца электрычнымі абагравальнікамі. А вось тут магчымасць пажару рэзка ўзрастае.**

Калі прааналізаваць штодзённыя зводкі аператыўнай абстаноўкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, то крывая даволі ярка вымалёўвае залежнасць ад надвор'я. Мяркуйце самі: калі за першыя 4 дні студзеня ў Беларусі адбылося 69 пажараў, на якіх 12 чалавек загінулі, то ўжо ў наступныя чатыры дні ратавальнікі адпраўляліся на барацьбу з агнём 145 разоў! Самымі «гарачымі» выдаліся выхадныя — яны сталі апошнімі ў жыцці для 18 чалавек.

Зіма на гэтым не заканчваецца. Як перажыць халоднае надвор'е бяспечна? Пра гэта карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з **афіцыйным прадстаўніком Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Крысцінай БАРЭЙКАЙ.**

### У лідарах — перагрэў печак

«Класічных» прычын пажараў менавіта ў моцныя халады ў прыватных дамах некалькі. Жаданне паліць печку як мага даўжэй без перапынкаў, калі «за бортам» мінус 20, немінуча прывядзе да яе перагрэву і ўзнікнення шчылін у корпусе, праз якія агонь пранікне ў хату. Таксама ратавальнікі раяць прыбіць каля топкі печкі металічны ліст памерам сама меней 50x70 см. Калі на яго незнарок выпадзе вугольчык, то бяды ўдасца пазбегнуць. Як бы моцна ні халадала за акном — за дзве гадзіны да сну паленне печы трэба абавязкова спыняць, інакш можна атруціцца чадным газам. Таксама нельга даручаць дзецям кантроль за агнём і пакідаць печку, якая паліцца, без нагляду. І забудзьце пры распальванні дроў пра лёгкаўзгаральныя вадкасці накшталт бензіну. Плясніў чалавек крыху вадкага паліва ў агонь, каб ён лепш разгараўся, — і імгненна ператвараецца ў жывы факел.

СТАР. 3

**■ Абітурыенту: новыя правілы**

# Чатыры тэсты і партфоліа



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Абітурыенты, якія будуць здаваць будучым летам ЦТ і якім не пашчасціць стаць студэнтамі, пры жаданні змогуць паспрабаваць паступіць са сваімі сертыфікатамі і ў наступным годзе. Прыёмныя камісіі будуць прымаць у абітурыентаў у 2018 годзе сертыфікаты як узору 2018 года, так і вынікі здачы ЦТ у 2017 годзе. Таксама ў прэтэндэнта на студэнцкі білет будзе магчымасць выбраць з вынікаў здачы ЦТ за два гады сертыфікаты з найлепшымі для сябе баламі і заявіць у прыёмную камісію, скажам, сертыфікат па матэматыцы за 2017 год, а па фізіцы за 2018 год. Павелічэнне тэрміну дзеяння сертыфікатаў ЦТ на два гады — адно з галоўных новаўвядзенняў, запісаных у новых Правілах прыёму ў ВНУ і ССНУ, якія былі зацверджаны Указам кіраўніка нашай дзяржавы 9 студзеня.**

СТАР. 4

# НАШ АГУЛЬНЫ КЛОПАТ — БЕЛАРУСЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Гісторыя прадаставіла нашым творчым людзям унікальны шанц — унесці свой уклад у станаўленне беларускай нацыі. Бо менавіта мы з вамі, пакаленні, якія жывуць цяпер, увасобілі ў жыццё шматвяковую мару нашых продкаў — стварылі першую ў гісторыі незалежную беларускую дзяржаву. І сёння наша агульная задача — зберагчы краіну і перадаць яе свабоднай і незалежнай тым, хто прыйдзе пасля нас», — заявіў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што незалежнасць не проста здабыць. Але яшчэ складаней адстаяць і абараніць. «Сіла духу, згуртаванасць і адзінства — менавіта тыя асновы, той падмурак, без якіх сёння не выжыць. Яшчэ тысячу гадоў таму Амар Хаям сказаў: «Той, хто ўпаў духам, гіне раней за тэрмін». І гэта вельмі дакладна! Бо толькі моцны духам чалавек ведае, што рабіць і куды ісці. Без моцнага стрыжня любы асуджаны на паражэнне. А нашаму народу сілы духу не займаць! Беларусы перажылі крывапралітныя войны, здолелі выстаяць у самыя цяжкія пасляваенныя часы, аднавілі краіну з руін, а ў нашы дні на скрыжаванні шляхоў, культур і гістарычных лёсаў адстойваюць суверэнітэт роднай краіны», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што да гэтага часу знаходзяцца тыя, хто спрабуе прадставіць беларусаў людзьмі без роду і племені. «З'яўленне такіх галасоў зусім не выпадковае. Незалежная Беларусь, якая жыве сваім розумам і працай, не па душы многім. Паклікание сапраўднага творцы супрацьстаяць любой хлусні, любому фальшу і крывадушнасці. Тым больш калі гаворка ідзе пра Айчыну, пра родную зямлю. Менавіта тут і ёсць поле духоўнай бітвы за Беларусь, за нашы каштоўнасці, ідэалы і традыцыі. І выйграць гэтую бітву, выйграць яе ў душах людзей — вось сапраўднае, вялікае паклікание ўсіх тых, каго мы ўшаноўваем сёння, і тых, хто сабраўся ў гэтай зале», — выказаў упэўненасць Прэзідэнт.

«Калі мы гаворым пра інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы, у свеце, плануем, каб гэтыя працэсы былі, мы зыходзім менавіта з гэтага: павінны быць як адзіная сям'я. І, самае галоўнае, у гэтай сям'і мы павінны быць раўнапраўныя», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

«Аснова нашага нацыянальнага характару ў чалавечнасці, спагадзе, дабрыні, спагадлівасці да чужога гора, празе справядлівасці. Быць можа, менавіта таму на нашай зямлі традыцыйна ўжываюцца розныя рэлігіі і народы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы ўсё часцей усведамляем Беларусь як агульны дом — сям'ю для ўсіх нас. Тут няма падзелу на сваіх і чужых, у сям'і працуюць разам і дапамагаюць адзін аднаму. Сям'я шчыра радуецца поспехам кожнага і разам клапоціцца пра кожнага свайго дамачадца, дзіця, старога».

Прэзідэнт падкрэсліў, што менавіта такая Беларусь сёння: добрая, чулая, свабодалюбная, незалежная, якая жыве ў гармоніі са сваімі суседзямі. «А якой ёй быць праз паўсотні гадоў, шмат у чым залежыць ад тых, хто сёння ў гэтай зале, ад усіх, хто называецца творцам. Бо сіла мастацтва ў тым, што яно можа гаварыць не толькі на мове розуму, але і на мове сэрца» , — перакананы кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама заўважыў, што каштоўнасць мастацтва ўзрастае ў сто разоў, калі яно служыць светлай і высакароднай мэце, дабру і міласэрнасці, роднай зямлі. «Менавіта такія дасягненні тых, каго мы ўзнагароджваем і віншуем. І ў гэтым іх асаблівая заслуга і сіла!» — сказаў на заканчэнне Прэзідэнт.

**Паводле БЕЛТА.**

# «ПЕДАГАГІЧНАЕ ВАЛАНЦЁРСТВА — НАЙЛЕПШАЯ ПРАКТЫКА»




**За актыўнае развіццё і папулярызацыю валанцёрскага руху сярод студэнцкай моладзі прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне» быў адзначаны калектыў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.**

**Рэктар БДПУ, прафесар Аляксандр ЖУК** лічыць такія чалавечыя якасці, як міласэрнасць, дабрыня, цярплівасць, любоў да бліжняга, абавязковымі для будучых педагогаў, бо перш, чым выхоўваць і вучыць дзіця, яго трэба палюбіць.

— Актыўны ўдзел нашых студэнтаў у валанцёрскай дзейнасці спрыяе фарміраванню ў іх не толькі прафесійных кампетэнцый, але і актыўнай грамадзянскай пазіцыі, развіццю духоўна-маральных і гуманістычных каштоўнасцяў, засваенню найважнейшага сацыяльнага досведу, — падкрэсліває ён. — Зараз на ўніверсітэце дзейнічаюць 10 валанцёрскіх клубаў і аб'яднанняў, якія ахопліваюць больш як 1300 студэнтаў. Валанцёры ўніверсітэта забяспечваюць сацыяльнае патранаванне выхаванцаў дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў, прытулкаў, цэнтраў рэабілітацыі, аказваюць дапамогу пажылым людзям, інвалідам і ветэранам, арганізуюць педагагічнае суправаджэнне дзяцей і падлеткаў, удзельнічаюць у рэстаўрацыйных работах і гэтак далей. Пры гэтым у нас ёсць і свая спецыфіка: веды, якія студэнты атрымліваюць на вучэбных занятках, дазваляюць ім ажыццяўляць псіхолага-педагагічнае суправаджэнне дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця (АПФР), дзяцей-інвалідаў, дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі. Асабліва актыўна педагагічнае суправаджэнне дзяцей з АПФР забяспечваюць студэнты Інстытута інклюзіўнай адукацыі з валанцёрскага аб'яднання «Роўнасць». Менавіта яны аказваюць сацыяльна-псіхалагічную падтрымку і дапамогу дзецям з цяжкімі і множнымі парушэннямі псіхафізічнага развіцця, аўтызмам, сіндромам Даўна, парушэннямі апорна-рухальнага апарату, слыху, зроку, маўлення.

Добраахвотніцтва ў педагагічным універсітэце грунтуецца на спалучэнні традыцый, пераемнасці і інавацыйных формаў дабрачыннасці. Найстарэйшае наша валанцёрскае аб'яднанне — агульнаўніверсітэцкі клуб «Міласэрнасць». Мэта яго ўдзельнікаў — дапамагчы наладзіць узаемаадносіны паміж грамадствам і асаблівымі дзецьмі. Дзіцячыя дамы, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі і гематалогіі ў Бараўлянах, адаптацыйна-аздараўленчая ўстанова «Востраў надзеі», дзіцячы дом-інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў Навінках — вось далёка не поўны пералік арганізацый, дзе нашы студэнты ўжо даўно сталі частымі гасцямі. З верасня 2014 года рэалізуецца праект «Бальнічны клоўн», скіраваны на сацыяльна-псіхалагічную рэабілітацыю дзяцей, якія знаходзяцца на лячэнні ў стацыянарах сталічных бальніц.

Два гады таму ў БДПУ адкрыўся валанцёрскі Цэнтр псіхалагічнай дапамогі замяшчальным сем'ям. На базе цэнтра дзейнічае пастаянны семінар-практыкум «Свет замяшчальнай сям'і» для прыёмных сем'яў і сем'яў усынавіцеляў.

Яшчэ адзін унікальны праект — валанцёрскі атрад «Дзеці сталіцы». У цэнтры ўвагі студэнтаў аказваюцца тыя дзеці, якія засталіся на лета ў горадзе. Валанцёры ходзяць па дварах, збіраюць школьнікаў, арганізуюць для іх спаборніцтвы, майстар-класы, конкурсы і гульні. Дзякуючы падтрымцы камісіі па справах непаўналетніх у работу праекта ўключаюцца дзеці і падлеткі з дэвіянтнымі паводзінамі.

Па словах Аляксандра Жука, валанцёрства стала адным з відаў педагагічнай практыкі студэнтаў. Выкладчыкі заўважылі, што першакурснікі і другакурснікі, якія займаюцца педагагічным валанцёрствам, сталі зусім па-іншаму ставіцца да лекцый па педагогіцы і псіхалогіі, іх матывацыя павысілася. Непасрэдная праца з дзецьмі — гэта найлепшая практыка, без якой любая тэорыя не мае сэнсу.

А ў апошнія два гады ў БДПУ стала актыўна развівацца яшчэ і спартыўнае валанцёрства: будучыя педагогі ахвотна ўдзельнічаюць у правядзенні гарадскіх і рэспубліканскіх спартыўных мерапрыемстваў і спаборніцтваў, у тым ліку і для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ДЫЯЛОГ КУЛЬТУР І ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

## Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва ўганараваны калектывы журналістаў

**Гэтай высокай узнагародай традыцыйна адзначаюцца дзеячы культуры і мастацтва, навукі, педагогі, аўтарскія калектывы, установы культуры за значныя дасягненні ў галіне выяўленчага і тэатральнага мастацтва, аматарскай творчасці, музейнай справы, выхавання моладзі.**

Так, прэмія прысуджана аўтарскаму калектыву рэдакцыі газеты «Голас Радзімы» ў складзе загадчыка аддзела Івана Ждановіча і спецыяльнага карэспандэнта Кацярыны Мядзведскай за плённае супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой і прафесійнае асвятленне пытанняў міжкультурнага дыялогу ў Беларусі.

— Прысуджэнне спецыяльнай прэміі Прэзідэнта нашаму калектыву — сведчанне таго, што дзяржава звяртае ўвагу на жыццё беларусаў за мяжой. Такая высокая ацэнка нашай дзейнасці — доказ таму, што мы пачуты, што наша праца запатрабаваная, — кажа **Іван ЖДАНОВІЧ.** — Асабліва важна, што прэмія стала пэўнага кшталту падсумаваннем вынікаў Года культуры, бо беларускія суполкі замежжа ажыццяўляюць у асноўным культурна-асветніцкую дзейнасць. Дзякуючы публікацыям у газеце «Голас Радзімы» беларускі свет становіцца шырэйшым, а дзякуючы прэміі — яго здабыткі больш вядомымі і блізкімі шырокай грамадскасці.

Узнагароды ўдастоены аўтарскі калектыў Беларускага тэлеграфнага агенцтва ў складзе фотарэдактара рэдакцыі візуальнай інфармацыі Ірыны Бубновай, генеральнага дырэктара Дзмітрыя Жука, начальніка аддзела падтрымкі і развіцця інтэрнэт-рэсурсаў Івана Сінічкіна за стварэнне і рэалізацыю інфармацыйна-публіцыстычнага праекта «Суверэнная Беларусь: эпоха дасягненняў», які праз архіўныя і сучасныя работы фотатэкі БЕЛТА ілюструе змены ў Беларусі за апошнія 20 гадоў, стварае кантраснае ўражанне аб дасягненнях краіны.

— Праз праект «Суверэнная Беларусь: эпоха дасягненняў» мы імкнуліся паказаць пакаленню, якое нарадзілася ў незалежнай сучаснай Беларусі, з чаго ўсё пачыналася, адлюстраваць тыя змены, якія мы разам зрабілі за апошнія 20 гадоў, — распавядае **генеральны дырэктар БЕЛТА Дзмітрый ЖУК.** — Чалавечая памяць мае адметнасці: мы стараемся забываць кепскае, таму крок, які краіна здзейсніла за апошнія дзесяцігоддзі, для многіх застаецца незаўважным. А вось здымкі нагадваюць пра пустыя вітрыны ў магазінах, талоны на цукар і масла. Параўноўваючы іх з сучаснасцю, пачынаеш больш цаніць тое, што мы маем сёння. Варта адзначыць, што праект падтрымалі людзі розных пакаленняў: як тыя, хто жыў у Савецкім Саюзе, так і сучасная моладзь.

Прэміі ўдастоены таксама і аўтарскі калектыў Белтэлерадыёкампаніі ў складзе намесніка галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 24» Яўгеніі Баранава, галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 1» Алены Ладуцькі, намесніка галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 1» Вольгі Саламахі за стварэнне на высокім прафесійным узроўні серыі іміджавых відэаролікаў «Мы зрабілі гэта разам», якія сталі візуальнай дэманстрацыяй дасягненняў краіны ў розных сферах і наглядна прадэманстравалі поспехі сучаснай Беларусі і станоўчую дынаміку яе развіцця за перыяд незалежнасці.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Без меж

# Адкрытыя практычна для ўсяго свету

## Уведзены бязвізавы рэжым для 80 краін

**Прэзідэнт дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №8 «Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян». Дакумент устанаўлівае адпаведную магчымасць наведвання нашай краіны на тэрмін не больш за 5 сутак для грамадзян 80 дзяржаў. Умова — уезд праз Нацыянальны аэрапорт Мінск.**

Указ распаўсюджваецца на 39 краін Еўропы, уключаючы ўвесь Еўрасаюз, а таксама Бразілію, Інданезію, ЗША, Японію і іншыя дзяржавы. Як гаворыцца ў дакуменце, у першую чаргу, гэта спрыяльныя ў міграцыйным плане дзяржавы, стратэгічныя партнёры Беларусі і краіны, што ў аднабаковым парадку ўвялі бязвізавы рэжым у дачыненні да беларускіх грамадзян. Новыя правілы ахопліваюць таксама такую катэгорыю, як неграмадзяне Латвіі і асобы без грамадзянства Эстоніі.

Паведамляецца, што такое рашэнне накіравана на актывізацыю падарожжаў бізнесменаў, турыстаў, прыватных асоб, якія маюць агульнаграмадзянскія пашпарты. Дзеянне дакумента не будзе распаўсюджвацца на замежнікаў, што ажыццяўляюць афіцыйныя паездкі.

Як адзначыў **начальнік галоўнага консульскага ўпраўлення Міністэрства замежных спраў Ігар ФІСЕНКА,** 80 дзяржаў — гэта асноўныя партнёры Беларусі ў свеце — усе еўрапейскія краіны, развітыя эканомікі свету, найбуйнейшыя краіны, якія развіваюцца.

«Спіс краін, натуральна, не выпадковы, і гаворка ідзе пра тое, каб адкрыць нашу краіну фактычна для ўсяго свету», — сказаў Ігар Фісенка. Ён таксама растлумачыў, чаму магчымасць бязвізавага знаходжання ў Беларусі ўстаноўлена на пяць сутак. «Гэта менавіта той тэрмін, на працягу якога замежніку няма неабходнасці рэгістравацца ў органах унутраных спраў. Такім чынам, у тых замежнікаў, якія будуць прыбываць без віз праз Нацыянальны аэрапорт Мінск, не будзе неабходнасці наогул выконваць нейкія фармальнасці: ні атрымліваць візу, ні рэгістравацца», — заявіў Ігар Фісенка.

«У плане афіцыйных кантактаў мы лічым, што неабходна прытрымлівацца правілаў узаемнасці. Гэта значыць, мы будзем адкрываць для афіцыйных кантактаў роўна настолькі, наколькі да гэтага будуць гатовы нашы партнёры. Такія прапановы намі накіраваны. Спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час мы атрымаем рэакцыю», — дадаў начальнік галоўнага консульскага ўпраўлення МЗС.

Ён нагадаў, што на працягу апошніх некалькіх гадоў Беларусь паслядоўна ішла да гэтага кроку. Спачатку было прынята рашэнне аб устанаўленні бязвізавага ўезду ў Белавежскую пушчу, а затым — у рэгіён, які прылягае да Аўгустоўскага канала. Вяршыняй гэтага працэсу, па словах Ігара Фісенкі, стала рашэнне, якое адкрывае фактычна ўсю краіну для бязвізавага ўезду.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Фінансы

# СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ СТАНЕ 17% ГАДАВЫХ

## Нацбанк различвае выйсці на адназначную велічыню інфляцыі сёлета ў першым квартале

**Фінансавы рэгулятар краіны паведамляе, што з 18 студзеня зніжаецца стаўка рэфінансавання з 18% да 17% гадавых і стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях Нацыянальнага банка па падтрымцы бягучай ліквіднасці банкаў з 23% да 22% гадавых.**

У паведамленні галоўнага банка гаворыцца, што гэтыя рашэнні па лініі працэнтнай палітыкі прымаліся з улікам шэрагу асноўных фактараў. Так, у лістападзе 2016 года гадавая інфляцыя знізілася да 11,4%. Паводле ацэнак, прырост спажывецкіх цэн па выніках 2016 года будзе ніжэй прагнозу (12%) — каля 11%.

Асобную ўвагу эксперты Нацбанка надаюць валютнаму рынку, дзе ў IV квартале летась працягнулася фарміраванне чыстай прапановы валюты, перш за ўсё з боку суб'ектаў гаспадарання і насельніцтва. Уклад курсавога фактару ў інтэнсіўнасць інфляцыйных працэсаў застаецца нязначным. «У цэлым складваюцца манетарныя ўмовы, якія абумовяць далейшае запавольванне гадавой інфляцыі і выхад яе на адназначную велічыню ў І квартале 2017 года», — паведамляюць у Нацбанку. Там упэўнены, што магчымасці далейшага зніжэння працэнтных ставак будуць вызначацца ўстойлівасцю зніжэння тэмпаў росту спажывецкіх цэн, а таксама станам плацежнага балансу Беларусі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Халодны студзень 2017-га

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— 2 студзеня позна ўвечары ў РАНС Маладзечанскага раёна раздаўся тэлефонны званок, на які адказаў дзяжурны па РУУС, — гаворыць Крысціна Барэйка. — Ён паведаміў, што ў вёсцы Новай загарэўся жылы дом. Калі ратавальнікі прыехалі на месца падзей, высветлілася, што моцныя апёкі атрымаў гаспадар — на ім загарэлася вопратка, пацярпелі ад агню і шафа з дыванам. Якраз побач з домам па вуліцы праходзілі мужчына і жанчына. Яны заўважылі водбліскі полымя ў вокнах, увайшлі ў хату і патушылі агонь яшчэ да прыезду ратавальнікаў. Але вось падручнымі сродкамі прыйсці на дапамогу гаспадару дома аказалася немагчыма. Яго экстранна шпіталізавалі ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы. Папярэдні дыягназ — стопрацэнтны тэрмічны апёк скуры 3-й і 4-й ступеняў. Апёкі атрымалі і дыхальныя шляхі. Прапакутаваўшы крыху больш за суткі, 4 студзеня 65-гадовы мужчына памёр. Прычына пажару пакуль высвятляецца. Але найбольш верагодная версія — неасцярожнае абыходжанне з лёгкаўзгаральнымі вадкасцямі падчас распальвання печы.

А 8 студзеня разарваўся ацяпляльны кацёл на цвёрдым паліве, які абаграваў жылы дом у Любані. Узгарання, на шчасце, не адбылося. Ніхто не пацярпеў. Але наступствы лёгкімі таксама не назавеш — абвалілася цагляная сцяна на плошчы ў 30 квадратных метраў. Ад катла і кацельнай засталіся адны рэшткі.

Што ж рабіць, калі сістэма ацяплення ў доме замерзла? Вызначыць, што ў трубах утварылася ледзяная «пробка», вельмі проста — пры адкрытых запорных механізмах цыркуляцыя вады не ідзе, а ціск на манометры пачынае перавышаць дапушчальныя паказчыкі для катла. Адагрэць яе можна пры дапамозе гарачага пяску, вады ці спецыяльна прызначанага для гэтага прыбора. Браць на ўзбраенне сюжэты старых кінастужак, калі трубы адагравалі адкрытым агнём паяльнай лямпы, катэгарычна забаронена — гэта можа прывесці да пажару. Асаблівую ўвагу надайце гарышчам — менавіта там расшыральныя бакі замярзаюць часцей за ўсё, асабліва калі яны не ўцеплены або калі па памяшканні гуляюць скразнякі.

Але сумным чэмпіёнам сярод магчымых версій пажараў у Мінскай вобласці стаў сёлета перагрэў печак. Іх назбіралася за час моцных маразоў ажно 6 выпадкаў! Праўда, пацярпелых няма. А вось з-за неахайнасці разыгралася трагедыя ў вёсцы Старая Мётча Барысаўскага раёна 5 студзеня. А 10-й раніцы паступіла паведамленне аб тым, што гарыць дом. Праз 15 хвілін ратавальнікі знайшлі пад сталом і вынеслі на вуліцу непрытомнага 86-гадовага гаспадара, які жыў адзін. Праз дзесяць хвілін урачы канстатавалі яго смерць. Пасля высветлілася, што печку мужчына ператварыў у склад вопраткі...

## ■ Першая дапамога

## Сагрэць дыханнем

**Пры ахаладжэнні неабходна як мага хутчэй сагрэцца і аднавіць кровазварот у пашкоджаных холадам тканках.**

У цёплым памяшканні трэба зняць замёрзлае адзенне. Пры абмаражэнні 1 ступені ахалоджаныя ўчасткі трэба сагрэць да пачырванення цёплымі рукамі, лёгкім масажам, расціраннем шарсцяной тканінай, дыханнем, пасля чаго накласці ватна-марлевую павязку. Пры абмаражэнні 2—4 ступені хуткае саграванне, масаж і расціранні рабіць не варта. Выклікайце ўрача. Тым часам на пашкоджаную паверхню можна пакласці павязку з добрай цеплаізаляцыяй (слой марлі — тоўсты слой ваты — слой марлі — цырата або гумавая тканіна). Пашкоджаныя канечнасці фіксуюць з дапамогай фанеры, кардону, прыбінтоўваючы іх зверху павязкі. У якасці цеплаізаляцыі можна выкарыстоўваць ватоўкі, фуфайкі, шарсцяную тканіну.

Пацярпеламу трэба даць гарачае піццё, гарачую ежу.

Нельга расціраць абмарожаныя ўчасткі снегам, каб не пашкодзіць сасуды і не занесці інфекцыю. Нельга саграваць абмарожаныя канечнасці каля вогнішча, самім прымяняць грэлкі і іншыя крыніцы цеплыні, а таксама расціраццa тлушчам або спіртам — усё гэта пагаршае абмаражэнне.

Пры агульным лёгкім пераахаладжэнні можна сагрэцца ў цёплай ванне пры пачатковай тэмпературы 24 градусы, якую паступова павысіць да нармальнай тэмпературы цела. Пры сярэдняй і цяжкай ступені агульнага ахаладжэння з парушэннем дыхання і кровазвароту трэба як мага хутчэй звярнуцца ў бальніцу, нагадвае **ўрач-валеолаг Леанід МЯЛЕШКА** ■

## Хто сапсаваў сталічнае паветра?

**Раніцай 10 студзеня ў многіх раёнах Мінска з'явілася смуга. А ў паветры пачаў лунаць прыкметны пах гару. Неспакой жыхароў сталіцы "падагравалі" паведамленні з суседняй Польшчы, дзе з-за смогу ў буйных гарадах была аб'яўлена трывога. Таму, на першы погляд, было б лагічна аб'яднаць гэтыя абставіны прычынна-выніковай сувяззю. Аднак...**

— Калегі з Брэста і Гродна не паведамляюць аб тым, што ў іх перавышаны ўзровень забруджвання паветра. Значыць, смог з Польшчы да Мінска дайсці не мог. Інфармацыі пра выкіды на прамысловых прадпрыемствах да нас таксама не паступала, — пракаментаваў сітуацыю **афіцыйны прадстаўнік Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Аляксандр ПАПКО.**

Кропкі над "і" расставілі ў Гідрамеце.

— Так, узровень вокісаў вугляроду і азоту ў атмасферы прыкметна павялічыўся. Самая высокая канцэнтрацыя гэтых рэчываў назіраецца на ўсходзе горада, — паведаміла **начальнік інфармацыйна-аналітычнага аддзела маніторынгу атмасфернага паветра Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Багдана КАЗЯРУК.** — У іншых раёнах гранічна дапушчальныя канцэнтрацыі не перавышаны. А ўсё вельмі проста. Людзі, якія жывуць у прыгарадзе Мінска і ў прыватным сектары, сталі больш спажываць паліва на ацяпленне з-за моцных маразоў. Адпаведна, павялічыліся і выкіды. Калі ў папярэдні дні паўночны вецер выцясняў шкодныя рэчывы са сталічнага паветра, то цяпер у Мінску назіраецца штыль. Да таго ж павысілася вільготнасць. Вось таму і адчуваецца ў паветры пах гару.

Сіноптыкі накіравалі папярэджанні прамысловым прадпрыемствам, хоць і кажуць, што абвінавачваць іх ва ўтварэнні бягучай сітуацыі з паветрам няправільна. Па папярэдніх прагнозах, з чацвярга ў прысталічны зноў задзьме вецер і абстаноўка палепшыцца.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*



## Халадовыя траўмы: рызыка застаецца

Больш за дзве сотні чалавек у Беларусі звярнуліся ад пачатку года да ўрачоў з халадовымі траўмамі — пераахаладжэннем і абмаражэннем канечнасцяў. Часцей за ўсё церпяць ад марозу вушы, рукі і ногі. Як тлумачылі самі пацярпелыя, хтосьці з іх выскачыў на 5 хвілін на вуліцу, а шапку не надзеў. Другі ўпусціў ключы ў сумёт і шукаў іх там голымі рукамі. Трэці забыў дома пальчаткі. Былі нават і тыя, хто прыгубіў спіртнога і... прылёг паспаць на снезе.

Па папярэдняй інфармацыі, моцныя маразы сталі прычынай шасці смерцяў у краіне. Аднак, як зазначылі ў Міністэрстве аховы здароўя, пра дакладную прычыну гібелі людзей казаць пакуль заўчасна — трэба дачакацца вынікаў судовай медыцынскай экспертызы.

Напрыканцы ж тыдня на змену палярнаму холаду прыйдзе ветранае надвор'е з невялікім «мінусам». А значыць, рызыка атрымання халадовых траўм застаецца, хоць і не будзе такой вострай.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

## • ТЫМ ЧАСАМ

## З марозам лепш не жартаваць

Чарговая ахвяра вялікіх маразоў — у Магілёўскай вобласці. У Чавускім раёне каля свайго дома ў вёсцы Капані знойдзены труп 78-гадовага пенсіянера. Папярэдні дыягназ смерці — пераахаладжэнне. Гэта ўжо трэцяя ахвяра на Магілёўшчыне з моманту ўзмацнення маразоў. У спісе таксама 31-гадовы бабруйчанін і 57-гадовы быхаўчанін.

Па інфармацыі **Магілёўскага абласнога цэнтра экстранай медыцынскай дапамогі,** толькі за суткі з 9 на 10 студзеня з халадовымі і галалёднымі траўмамі ва ўстановы аховы здароўя вобласці звярнуліся 106 чалавек, у тым ліку 8 дзяцей. У пацярпелых — абмаражэнне канечнасцяў, вушэй альбо агульнае пераахаладжэнне.

У Магілёве быў выпадак, калі дапамога ўрачоў спатрэбілася 14-гадоваму падлетку, які лізнуў на марозе металічны прадмет і прыліп да яго. Пакуль ехала хуткая дапамога, сябры (па парадзе медыкаў) ратавалі таварыша з дапамогай вады пакаёвай тэмпературы. Гэта, кажуць спецыялісты, адзіны спосаб вызваліцца без болю.

Бабруйскія ратавальнікі на працягу апошніх некалькіх дзён тройчы выязджалі да заложнікаў вялікіх маразоў. Дапамога спатрэбілася сямейнай пары, у якой пасля запраўкі саляркай заглух матор легкавога аўтамабіля, дальнабойшчыку, у якога разрадзіўся акумулятар, і... ДАІ, якая паведаміла, што на аўтамабільным кальцы «замерз» пасажырскі «гармонік» і перашкаджае руху астатняга транспарту.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# СЛЕД У СЛЕД

## Аўтагоншчыкі МАЗа скарачаюць адставанне ад лідараў «Дакара-2017»



**Экіпаж пад кіраўніцтвам Сяргея ВЯЗОВІЧА завяршыў сёмы этап ралі-рэйду на пятым месцы і наблізіўся да першай дзясяткі ў агульным заліку.**

Сёмы этап аказаўся досыць небяспечным з-за праліўных дажджоў, якія абрынуліся на Балівію, дзе праходзілі гонкі. З-за такіх умоў арганізатары вырашылі практычна ўдвая скарачіць спецучастак — да 161 км. Частка маршруту прайшла па трасе шостага адрэзка гонкі, які раней адмянілі з меркаванняў бяспекі.

На праходжанне спецучастка МАЗу Сяргея Вязовіча спатрэбілася 1 гадзіна 47 хвілін, беларус саступіў пераможцу — гоншчыку каманды «КамАЗ-майстар» Дзмітрыю Сотнікаву ўсяго 5 хвілін. Наперадзе экіпажа Сяргея Вязовіча таксама аказаліся тры грузавікі Iveco, у тым ліку галандца Жэрара дэ Роя, які лідзіруе ў гонцы па суме сямі этапаў.

У агульным заліку Сяргей Вязовіч падняўся на 16-е месца. Лідарам гонкі застаецца Жэрар дэ Рой, якому зараз наш экіпаж саступае 3 гадзіны 25 хвілін.

Яшчэ адзін беларускі экіпаж пад кіраўніцтвам Аляксея Вішнеўскага фінішаваў на сёмым этапе на 16-й пазіцыі. У генеральнай класіфікацыі ён захоўвае 20-е месца. МАЗ Аляксандра Васілеўскага з-за праколу фінішаваў толькі 20-м.

*— Трохі засмучаныя тым, што спецучастак скарацілі, паколькі мы стараемся выкарыстоўваць любую магчымасць, каб павысіць свае пазіцыі. Спецучастак прайшлі ўпэўнена, аднак без неабходнасці стараліся не рызыкаваць — ліўні размылі большую частку трасы. На жаль, Аляксандр Васілеўскі пракалоў кола, якое прыйшлося экстранна замяняць, таму ён фінішаваў не ў першай дзесятцы,* — адзначылі ў камандзе «МАЗ-СПОРТаўта».

Наступны восьмы этап прывядзе гоншчыкаў у аргенцінскі горад Сальта. Працягласць спецучастка там, мяркуецца, складзе 492 км, аднак арганізатары могуць унесці змены ў маршрут. Чакаецца, што на ўчастку гэтага этапу экіпажы сутыкнуцца з сур'ёзнымі перашкодамі ў выглядзе пяшчаных дзюн.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*



# У ДТЗ пацярпелі дзеці

## Аварыі адбыліся ў Стаўбцоўскім раёне і Пскоўскай вобласці

**Учора каля 8 гадзін раніцы ў службу выратавання паступіла паведамленне пра дарожна-транспартнае здарэнне паблізу вёскі Залужжа Стаўбцоўскага раёна. Патрэбна была дапамога ў дэблакіроўцы чалавека, апроч таго ў аварыі пацярпелі дзеці.**

Здарэнне адбылося на трасе Брэст — Мінск: сутыкнуліся два мікрааўтобусы, адзін з якіх быў маршрутным таксі, расказалі падрабязнасці ў Мінскім абласным упраўленні МНС. У ім знаходзіліся кіроўца і 15 пасажыраў, з якіх шасцёра — дзеці. Гэта былі школьнікі 6, 8 і 9—10 класаў з Іванава, якія ў суправаджэнні педагога накіроўваліся на аздараўленне ў дзіцячы лагер «Зубраня». У выніку аварыі дзеці атрымалі нязначныя траўмы ў выглядзе ўдараў. Іх даставілі ў дзіцячае аддзяленне. Педагога ратавальнікам давялося даставаць з маршрутнага таксі пры дапамозе спецыяльнага гідраўлічнага інструмента. Жанчына 1983 года нараджэння шпіталізаваная ў бальніцу ў Стоўбцах з падазрэннем на перелом і вывіх сцягна. Іншыя шасцёра пасажыраў маршруткі самастойна праследавалі да месца прызначэння. Кіроўца іншага мікрааўтобуса пасля медыцынскага агляду ад шпіталізацыі адмовіўся. Прычыны аварыі ўдакладняюцца.

І ўчора ж у ДТЗ патрапілі беларускія дзеці ў Пскоўскай вобласці: тут фура ўрэзалася ў аўтобус, які іх перавозіў. Аварыя адбылася ў Струга-Красненскім раёне. У населеным пункце Ротны Двор вялікагрузны аўтамабіль сутыкнуўся ў аўтобусам. Згодна з папярэднімі звесткамі, загінулых няма, пяць чалавек атрымалі нязначныя траўмы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Чатыры тэсты і партфоліа

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Гэта мера дапаможа абітурыентам больш спакойна ставіцца да прыёмнай кампаніі і зменшыць нервознасць, — упэўнены **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.**

## КАБ НЕ ЗАСТАЦЦА ЗА БОРТАМ

Яшчэ адно важнае навасўядзенне — магчымасць здачы цэнтралізаванага тэсціравання па чатырох вучэбных прадметах. Адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ, **дэкан факультэта даўніверсітэцкай адукацыі Вячаслаў МАЛАФЕЕЎ** патлумачыў, што наяўнасць чацвёртага сертыфіката асабліва важная для спецыяльнасцяў, якія знаходзяцца на стыку галін ці прадметных абласцей. Скажам, пры паступленні на хімічны факультэт БДУ на спецыяльнасць «хімія лекавых злучэнняў» трэба здаваць хімію і біялогію, а на «хімію высокіх энергій» — хімію і матэматыку. І калі абітурыент не праходзіць па сваіх балах на запатрабаваную ў моладзі першую спецыяльнасць, то ён не можа падаць свае дакументы на іншую спецыяльнасць хімічнага факультэта. На геаграфічным факультэце ёсць спецыяльнасці, дзе профільнымі дысцыплінамі з'яўляюцца геаграфія і матэматыка, а ёсць спецыяльнасць, дзе трэба прад'явіць сертыфікаты па геаграфіі і фізіцы (надзвычай рэдкі набор сертыфікатаў, які больш нідзе не патрабуецца). Цяпер абітурыенты, маючы на руках чатыры сертыфікаты, змогуць спакойна выбіраць з пераліку спецыяльнасцяў у межах аднаго факультэта.

А вось баяцца змяненняў у структуры ЦТ у гэтым годзе не варта. Частка А ( з варыянтамі адказаў) і В (без прадстаўлення выбару) застаецца ва ўсіх тэстах. З'яўленне часткі С, дзе абітурыент павінен даць разгорнуты адказ ці напісаць міні-эсэ, якая ёсць у тэстах расійскага Адзінага дзяржаўнага экзамену, пакуль нашым абітурыентам не пагражае.

## ДАДАТКОВЫ ШАНЦ

Істотным плюсам можна лічыць з'яўленне трох рэзервовых дзён для здачы ЦТ. Раней быў прадугледжаны ўсяго адзін такі дзень, і калі абітурыент захварэў і прапусціў, напрыклад, два ЦТ, ён вымушаны быў страчваць цэлы год. Да таго ж спартсмены маглі прапусціць здачу ЦТ з-за важных спаборніцтваў, музыканты — з прычыны ўдзелу ў фестывалях і г.д.

Цяпер у іх будзе магчымасць скарыстацца рэзервовымі днямі. Таксама тры рэзервовых дні для праведзення ЦТ дадуць шанц паўдзельнічаць у конкурсе на бюджэтныя месцы абітурыентам з Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана, якія не паспявалі прыехаць у Беларусь у чэрвені, каб здаць ЦТ разам з беларусамі, паколькі ў гэты ж час яны здавалі свае нацыянальныя экзамены. У іх была адзіная магчымасць стаць студэнтам беларускай ВНУ — праходзіць субяседаванне восенню і паступаць на платную форму навучання як замежным грамадзянам з адпаведнымі «расцэнкамі» за вучобу.

**Выпускнікам педагагічных класаў, якія будуць паступаць па выніках субяседавання, трэба будзе адпрацаваць па размеркаванні пяць гадоў, а не два**

**Начальнік упраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ** расказаў, што пры паступленні на скарочаную форму навучання ў ВНУ выпускнікам каледжаў цяпер не трэба будзе здаваць ЦТ.

— Размова ідзе пра выпускнікоў каледжаў, якія паступаюць на родныя спецыяльнасці ў ВНУ, — патлумачыў ён. — Для гэтай катэгорыі абітурыентаў прадугледжаны два ўступныя экзамены па дысцыплінах вучэбнага плана сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што вызначаюцца прыёмнай камісіяй ВНУ. Раней абітурыенты павінны былі здаваць ЦТ па рускай ці беларускай мове, а таксама непасрэдна ў ВНУ вуснае або пісьмовае выпрабаванне па профільным прадмеце, які яны вывучалі ў каледжы. Цяпер сітуацыя для іх змяняецца....

Значна спрашчаюцца ўмовы для паступлення абітурыентаў на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю.

— Яны змогуць здаваць па выбары або цэнтралізаванае тэсціраванне і падаваць у прыёмную камісію свае сертыфікаты, або здаваць унутраныя экзамены, — праінфармаваў Сяргей Каспяровіч. — Для ўсіх, хто паступае ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю, а таксама ў ВНУ іншага профілю, але на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці, вызначаны адзіны падыход. Абітурыенты будуць здаваць толькі два ўступныя іспыты па профільных прадметах. Здаваць экзамен па дзяржаўнай мове ім не давядзецца.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЛЬГОТА... ПА РЭКАМЕНДАЦЫІ

Вельмі важнае змяненне ў новай рэдакцыі правілаў тычыцца выпускнікоў педагагічных класаў. Сёння ў 11-х класах профільнай педагагічнай накіраванасці навучаюцца каля 1,5 тысячы чалавек па ўсёй краіне. Яны змогуць паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без здачы ЦТ па выніках субяседавання. Але для таго, каб скарыстацца такой прывілеяй, выпускнікі павінны будуць выканаць шэраг даволі жорсткіх патрабаванняў.

Адзнакі па профільных прадметах у іх павінны быць не ніжэй за 8 балаў, а па ўсіх астатніх прадметах школьнай праграмы — не ніжэй як 7 балаў. Акрамя таго, старшакласнікі павінны абавязкова засвоіць праграму факультатыва «Увядзенне ў педагагічную прафесію» аб'ёмам 140 вучэбных гадзін за два гады. І, нарэшце, кожны прэтэндэнт на льготу павінен будзе атрымаць разгорнутую характарыстыку-рэкамендацыю, зацверджаную педсаветам. А яна выдаецца па выніках створанага адзінаццацікласнікам уласнага партфоліа. Гэта значыць, што школа нясе поўную адказнасць за аб'ектыўнасць выдадзенай рэкамендацыі. Уключэнне гэтай нормы ў Правілы прыёму дазволіць вырашыць задачу, пастаўленую Прэзідэнтам, — адабраць на педагагічныя спецыяльнасці добра матываваных і падрыхтаваных абітурыентаў.

Але ёсць тут і «лыжка дзёгцю». Выпускнікам педагагічных класаў, якія будуць паступаць па выніках субяседавання, трэба будзе адпрацаваць па размеркаванні пяць гадоў, а не два, як абітурыентам, якія паступаюць на агульных падставах.

**Адказны сакратар прыёмнай камісіі, дэкан факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі БДПУ імя М.Танка Сяргей ЯКАВЕНКА** лічыць, што пяцігадовая адпрацоўка па размеркаванні не адштурхне абітурыентаў з ліку выпускнікоў педагагічных класаў.

— Мы праводзілі маніторынг і ўстанавілі, што 65—80% выпускнікоў, адпрацаваўшы два гады пасля заканчэння ўніверсітэта, застаюцца ў той жа школе. Напрыклад, у Клецкім раёне засталіся 100%, у Бярэзінскім — 91%, у Мядзельскім — 83%, — прывёў ён свае аргументы. — Не варта забываць, што ў невялікіх населеных пунктах школа з'яўляецца надзейным працоўным месцам. У гэтым пытанні таксама многае залежыць ад падтрымкі маладых спецыялістаў мясцовымі ўладамі. Разам з тым, калі выпускнікі педкласаў не пажадаюць паступаць ва ўніверсітэт на такіх умовах, яны змогуць удзельнічаць у агульным конкурсе і здаваць пры паступленні цэнтралізаванае тэсціраванне.

**Цяпер абітурыенты, маючы на руках чатыры сертыфікаты, змогуць спакойна выбіраць з пераліку спецыяльнасцяў у межах аднаго факультэта.**

Захавалася льгота на паступленне без экзаменаў на педагагічныя спецыяльнасці таксама і для ўладальнікаў школьных медалёў, дыпломаў аб заканчэнні ССНУ з адзнакай і пераможцаў алімпіяд.

З іншых змяненняў, якія былі ўнесены ў новы парадак прыёму, варта адзначыць магчымасць паступаць на завочную форму навучання жанчынам, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе за дзіцем, без наяўнасці ў іх стажу працы па профілю будучай спецыяльнасці. А пры паступленні на спецыяльнасці сацыяльнага профілю ўладальнікі валанцёрскіх кніжак будуць мець перавагаі права на залічэнне пры іншых роўных умовах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Не абмініце

# Год Купалы. Пачатак

2017 год абяцае быць багатым на яркія культурныя праекты, шырокія нацыянальныя святы і літаратурныя імпрэзы. Думаецца, многія з іх пройдуць пад зоркай сёлетняга юбіляра, народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. 135-годдзе класіка наша краіна пачне адзначаць ужо сёння. Так, увечары ў Дзяржаўным літаратурным музеі паэта будзе дадзены пачатак сапраўднаму сваточнаму марафону. У юбілейны год плануецца мноства праектаў, акцый, якія стануць данінай павагі і памяці аднаму з найлепшых нацыянальных паэтаў.

Ужо сёння святочныя мерапрыемствы распачне прэзентацыя партрэта Янкі Купалы работы рускага мастака Мікалая Паўлава, які перадасць у дар музею класіка старшыня Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Сяргей Кандыбовіч.

Мяркуецца, што ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця Купалаўскага года таксама возьмуць удзел міністр культуры Барыс Святлоў, прадстаўнікі дыпламатычных місій, пісьменнікі, навукоўцы, акцёры, музейныя супрацоўнікі.

Падчас урачыстасці ў выкананні акцёраў Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі прагучаць вершы Янкі Купалы, а выкладчыкі і студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі выканаюць песні на яго словы.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

# СПАСЦІЖЭННЕ НАРОДНАГА ХАРАКТАРУ

**Купалаўскі год — выдатная асветніцкая, духоўная ініцыятыва. Народны песняр у сваё 135-годдзе павінен выйсці за сцены музеяў і бібліятэк. Яго вершы павінны судакрануцца з душамі і сэрцамі беларусаў. І не толькі жыхароў Беларусі... Сёння пра Янку Купалу разважаюць нашы сябры з Расіі.**

**Сяргей КАНДЫБОВІЧ, старшыня ФНКА «Беларусы Расіі» (Масква):**

— Я асабіста атаясамляю Беларусь, сваю родную старонку, з праявамі культуры, духоўнасці. Таму лічу, што вобраз Янкі Купалы — самы каштоўны вобраз для захавання ў кожным з беларусаў прысутнасці сваёй Радзімы. Быў бы рады, калі б і сёлета ў Расіі, напрыклад, у Татарстане, з'явіўся яшчэ адзін помнік аўтару неўміручых вершаў. Тых вершаў, многія з якіх сталі песнямі, многія з якіх гучаць на ўвесь свет. Мне асабліва імпануе купалаўскае слова, агучанае вялікім ураджэнцам Расіі Уладзімірам Мулявіным, яго ансамблем «Песняры».

**Лула КУНІ, паэт, галоўны рэдактар часопіса «Нана» (Чачэнская Рэспубліка, Грозны):**

— Феномен высокай запатрабаванасці паэтычнай спадчыны Янкі Купалы, мяркую, — у акумуляванні ў ім своеасаблівага кода беларускага этнасу. Праўдзівасць паэтычнай інтанацыі, вернасць народнай мове, жаданне жыць і ствараць у адным «рытме сэрца» са сваім народам ставяць вялікага беларускага паэта ў адзін рад са знакавымі імёнамі класікаў сусветнай паэзіі. Доўгае існаванне ў цісках таталітарнай сістэмы прывучала нас да вострага ўспрымання глыбінных сэнсаў літаратуры. Вось таму такой актуальнай падаецца творчасць знакавых асоб у нацыянальных літаратурах савецкай дзяржавы ў сённяшняй культурнай прасторы постсавецкага перыяду. Гэта ж не толькі наша ўчора. Гэта наша сёння. Не ў выніку нейкай палітычнай рэмінісцэнцыі — а ў знак разумення пераемнасці выклікаў часу і наступальнага развіцця грамадскай самасвядомасці. Мо, таму такімі блізкімі кожнаму з нас падаюцца радкі Янкі Купалы, напісаныя яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя: «Хто ты гэтакі?/ — Свой, тутэйшы. / Чаго хочаш?/ — Долі лепшай./ Якой долі?/ — Хлеба, солі. / А што болей?/ — Зямлі, волі. / Дзе радзіўся?/ — У сваёй вёсцы./ Дзе хрысціўся?/ — Пры дарожцы. / Чым асвенчан?/ — Кроўю, потам./ Чым быць хочаш?/ — Не быць скотам».

Высокі трагізм паэзіі Янкі Купалы прыцягвае ўвагу новых і новых пакаленняў чытачоў, робіць яе сучаснай і актуальнай сёння.

**Роберт МІНУЛІН, народны паэт Татарстана (Рэспубліка Татарстан, Казань):**

— Янка Купала судакрануўся з нашай старонкай у ваенным ліхалецці. Народнага песняра Беларусі і цяпер памятаюць у Татарстане. Шмат перакладаў Купалу наш вядомы літаратар Закі Нуры, які, дарэчы, партызаніў у Беларусі ў складзе атрада Канстанціна Заслонава. Ды і іншыя татарскія мастакі слова былі ўважлівыя да творчай спадчыны сусветна вядомага творцы. Чым асабіста мне дарагі Купала? Не будзе перабольшаннем сказаць, што яго паэзія надзвычай зразумелая мне, як і кожнаму простаму чалавеку. У вершах беларускага паэта ёсць галоўнае — спрадвечнае імкненне людзей да лепшага і адкрытага, шчырага, сумленнага жыцця. Веру, што Янку Купалу будуць яшчэ доўга і доўга чытаць пакаленні нашых наступнікаў. Неўміручасць сапраўднай паэзіі грунтуецца на тым, што з вершаў легендарнага майстра нацыянальнай літаратуры крынічыць святло мар і памкненняў, жаданне зазірнуць за далягляды.

**Запісаў Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

■ Свята працягваецца

# Цудоўны настрой

**Усе дзеці, якія знаходзяцца на стацыянарным лячэнні ў абласной дзіцячай бальніцы, атрымалі калядныя падарункі ад епіскапа Гомельскага і Жлобінскага Сцяфана. Ён наведаў у тым ліку палаты ў рэанімацыйным аддзяленні, дзе блаславіў дзяцей і падтрымаў цёплымі словамі бацькоў, павіншаваў усіх са святам Раства Хрыстова:**

— Свята Раства Хрыстова дорыць любоў старэйшага пакалення да малодшага, і сёння царква моліцца за гэтых дзяцей, каб Бог хутчэй даў ім акрыянне, каб яны прыйшлі ў свае сем'і і цешылі бацькоў. Гэта акрыянне і будзе, напэўна, цудам у іх жыцці.

Калядныя акцыі Гомельскай епархіі ў абласной дзіцячай клінічнай бальніцы сталі традыцыйнымі. Сёлета дзеці атрымалі ласункі, наборы цацак у гульнявыя пакоі, а таксама тэлевізар і DVD-прыстаўку ў кардыялагічнае аддзяленне.

У горадзе над Сожам прайшла і Архірэйская ёлка. Мерапрыемства сабрала ў Гомельскім дзяржаўным тэатры лялек больш за 600 дзяцей, сярод якіх дзеці святароў, дзеці-сіроты, дзеці з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, якія пражываюць у раёнах, найбольш пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. Дзеці пабачылі спектакль і атрымалі калядныя падарункі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# НА ЗАСТАВЕ З САЛДАЦКАЙ КАШАЙ

**Працягваецца рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Ваеннаслужачыя Брэсцкай пагранічнай групы ў гэтыя дні наведалі некалькі дзіцячых устаноў. А для выхаванцаў Брэсцкага сацыяльнага прытулка і дзяцей, якія выхоўваюцца ў прыёмных сем'ях абласнога цэнтра, была арганізавана паездка ў рэзідэнцыю Дзеда Мароза.**

Пасля наведвання сядзібы галоўнага навагодняга персанажа дзеці паехалі на самую сапраўдную пагранічную заставу «Перароў». Там яны ўбачылі ваенную тэхніку, зброю, службовых сабак, пабывалі ў музеі баявой славы. Юных гасцей пачаставалі салдацкім абедам, а ў канцы праграмы яны атрымалі навагоднія падарункі.

Калі ў музея Заслонава з'явіцца асобны будынак, музейныя супрацоўнікі казаць не бяруцца — не ў іх кампетэнцыі. Тое, што ён дакладна будзе, пацвердзіла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Аршанскага райвыканкама Ганна Святлова. Адновяць стары будынак ці з'явіцца новы, пакуль вырашаецца. Газета «Звязда» будзе сачыць за сітуацыяй.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
■

# Беларускі народны каляндар на 2017 год

**НАРОДНЫ КАЛЯНДАР** — *гэта сістэма пастаянных ці рухомых свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, звычаяў, што замацаваны ў быце і фальклоры. Уяўляе пераважна спалучэнне язычніцкай і хрысціянскай культур. Гэта — фальклорны каляндар: ён складзены на аснове хранонімаў, якія зафіксаваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў, і ўключае традыцыйныя арыенціры на сельскагаспадарчыя работы і адпачынкі ў гадавым, сезонным, месяцавым і іншых цыклах-рытмах. Сістэматызаваны беларускі народны каляндар у складзе з велікодна-валачобнымі песнямі, якія ў строгай храналагічнай паслядоўнасці апісваюць традыцыйныя прысвяткі і святы, у тым ліку тыя, што закансерваваліся ў непараўнальных паэтычных узорах як Навагоддзі/Навалецці, з'яўляецца нашым шэдэўрам і фенаменальнай з'явай сусветнай нематэрыяльнай культуры.*

***У народным календары на 2017 год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі, урыўкамі з валачобных песень і г. д. Дні (хранонімы), якія адзначаюць беларусы-католікі, выдзелены курсівам. У праваслаўных яны замацаваны за старым, юліянскім, календаром, што мае 13 лішніх дзён. Зорачкай /*/ пазначаны святы «рухомай» царкоўнай пасхаліі.***

***У наступным, 2018-м, годзе па праваслаўнай пасхаліі Вялікдзень (Пасха) 8 красавіка, па каталіцкай — 1 красавіка.***

***Умоўныя абазначэнні: п — панядзелак, а — аўторак, с — серада, ч — чацвер, пт — пятніца, сб — субота, н — нядзеля. Даўжыня дня і моманты ўсходу і заходу ў дні сонцастаяння і раўнадзенства падаюцца для Мінска. Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў календара можна прачытаць у нашых кнігах «Беларускі народны каляндар» (Мінск, 1993, 2002).***



Народны ансамбль «Вязанка» з вёскі Вяззе Асіповіцкага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**СТУДЗЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**ЛЮТЫ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | | | | | |

**САКАВІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

**КРАСАВІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |

**МАЙ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

**ЧЭРВЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

**ЛІПЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

**ЖНІВЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

**ВЕРАСЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

**КАСТРЫЧНІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**ЛІСТАПАД**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

**СНЕЖАНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

## Студзень

**1. н. Новы год.** ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 годзе, Расія — з 1700 года «А хто ўпярод? Новы ж год».

**6. пт. Першая, Посная куцця.** Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Тры Каралі.*** Католікі праводзілі маскіраваны абрад «Тры каралі», або «Гэроды».

**7. сб. Раство Хрыстова.** Пачатак **Каляд**. «Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі...». Калядавалі. Насілі «звязду». Паказвалі батлейку. На Каляды праводзілі ігрышчы («вадзілі казу», «жанілі Цярэшку», «пяклі ката», гулялі ў «Яшчура» і інш.).

**9. п. Сцяпан.** «На святога Сцяпана вышэй слуга за пана».

**13. пт. Шчодрая куцця.** Пачатак Шчодрага тыдня. «Мароз, хадзі куццю есці».

**14. сб. Васілле. Новы год** па праваслаўным календары. «Сею, сею пасяваю, з Новым годам вас вітаю».

**18. с. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця.** Апошнія дні Каляд. «Каляда ад'язджае».

**19. ч. Вадохрышча (Кшчэнне).** «Святое Кшчэнне ваду ксціла, свет ачысціла і ваду наверх пусціла», «На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама».

**20. пт. Прывадохрышча** — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

**24. а. *Аксіння*.** «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце». **Фядос**. «На Фядоса цёпла».

**25. с. Таццяна.** Свята студэнтаў. ***Павел***. «Вее вецер — будзе вайна».

**31. а. Апанас, Гусінае свята.** Свята свойскай жывёлы. «Хавай нос у апанасаўскі мароз».

## Люты

**1. с. *Ігнат*.** «На святога Ігната зіма багата».

**2. ч. *Грамніцы, Стрэчанне*.** «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы», «Грамніца — хлебу палавіца».

**5. н. *Агата*.** Каровіна свята. «Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты».

**6. п. Паўзімніца Аксіння.** «На Аксінню мяце». ***Дарота***. «Па Дароце высахнуць хусты на плоце».

**11. сб. Ігнат.** «Ігнат Грамніцам рад».

**12. н. *Памінальніца.** Памінальны тыдзень. Калі «вея» ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі «дзесяцінкі дзве».

**14. а. Трыфан.** «На Трыфана зорна — вясна позняя». ***Валянцін***. Свята закаханых.

**15. с. Грамніцы, Стрэчанне.** «Зіма з летам сустракалася...», «На Грамніцы палавіна зіміцы».

**18. сб. Агата.** Каровіна свята.

**19. н. *Рабы тыдзень, Малая вясельніца, Развітальны, Сырапусны тыдзень.** Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленным тыдні, у той дзень ад Іллі сеялі лён. Дзяўчаты вешалі «калодкі» нежанатым хлопцам.

**22. с. *Лысая серада.** Праталіны-залысіны.

**23. ч. *Блакітны чацвер.** Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. «На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі».

**24. пт. *Дзедава пятніца. Улассе.** Свята жывёлы. «Аўлас на сыры лас». Мацей. «На Мацея дарога пацее», «На Мацея адліга — будзе мароз».

**25. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы).** «Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі».

**26. н. *Маладзік у 17.58 (колападобнае сонечнае зацьменне).* *Масленіца.** «Масленіца ў «вятху» (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку». ***Гуканне вясны.** «Благаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці». На Палессі вадзілі карагоды, «спявалі чырачку», насілі ёлку з вянком. **Фацінне**. Заступніца ад хвароб.

**27. п. *Паласказуб.** Першы дзень Вялікага посту. Паласкалі зубы гарэлкаю.

## Сакавік

**1. с. **Серада Папяльцовая*** (пач. Вялікага посту ў католікаў). ***Уступная серада.** Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і пераскоквалі цераз пень.

**4. сб. *Зборава субота.** Абрад «споведзі дзежкі». ***Казімір***. «Святы Казімір дровы сякець».

**5. н. *Зборніца, Ізбор.** Адзін з варыянтаў Новага года/лета ў час прыняцця юліянскага летазлічэння. «Святы Ізбор упярод ступіць». Пачатак збору ў поле.

**9. ч. Янка, Паўраценне.** Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок.

**12. н. *Рыгор*.** «На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора».

**13. п. Васіль Капальнік.** Са стрэх капае.

**14. а. Аўдоцця Вясноўка. Гуканне вясны.** «На Аўдокі голы бокі». (1.03 Новы год у мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль). «Святы Еўдакей ... пераступ года».

**15. с. Хвядот.** «На Хвядота занос — усё сена знясе».

**17. пт. Герасім Гракоўнік.** «Герасім гракоў прыгнаў».

**19. н. *Язэп*.** «Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту». «На Язэпа пагода — год ураджайны».

**20. п.** *Пачатак ***Храстовага тыдня***. Пяклі «храсты». Засеўкі. Абрад «жаніцьбы коміна». Вясновае раўнадзенства. Усход 7.17, заход 19.17.

**22. с. *Серадапосце.** Выпякалі «храстцы». **Саракі**. Было Новым годам/летам. «Святыя Саракі наперад пайшлі». Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. «Святыя Саракі ў поле саху валаклі». **Прыска**. «На святога Прыску праб'е лёд і пліска».

**25. сб. Рыгор.** «На Рыгора зіма ідзе ў мора». ***Дабравешчанне, Звеставанне.*** «І птушка гнязда не кладзе». Прылёт бусла. Гуканне вясны. Было Новым годам. «Перша свята — нова летца, Благавешчан зямлю сушыць».

**26. н. Міжблагавешчыны** (да 7 красавіка). Забарона на «запасванне» кароў.

**27. п.** Пачатак ***Пахвальнага тыдня**. «Дзікая качка яйцом пахваліцца». ***Арына***. «На Арыну сей капусту ў расадніках».

**30. ч. Аляксей Цёплы.** Дзень рыбалова. «На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою».

**31. пт. *Пахвальная пятніца.** Мыццё дзежак. **Палікарп**. Пачатак бясхлебіцы.

## Красавік

**1. сб. *Пахвальная (Мезіна) субота**. Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў. Дар'я Вясенняя. Адбельвалі палотны.

**3. п.** Пачатак ***Вербнага тыдня.**

**6. ч. Камаедзіца.** Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі «буславы лапы».

**7. пт. Дабравешчанне.** «Дабравешчанне без ластавак — халоднае лета». Абрад «Страла».

**8. сб. Благуста.** «На Благусту сей капусту».

**9. н. **Пальмова нядзеля.*** «Вярба б'е, не я б'ю». ***Вербніца. Матрона.** «На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае».

**10. п.** Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце.

**11. а. *Чысты аўторак.** Каб на людзей і «гаўядо» не напала «парша», трэба ўсё мыць.

**12. с. *Дравяная страсць.** Мыюць усё драўлянае.

**13. ч. *Чысты чацвер.** Лазня. Абрад мыцця дзежкі.

**14. пт. *Чырвоная, Велікодная, пятніца.** Сеялі гарох. **Прабуджэнне хатніка. Мар'я.** Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.

**15. сб. *Вялікая, Чырвоная, субота.** Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту.

**16. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ** (у праваслаўных і католікаў). «Хрыстос уваскрэс! — Сапраўды ўваскрэс!».

**Мікіта.** «Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам».

**17. п.** Працяг ***Велікоднага тыдня.** «Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні пагуляюць, а апошні дзень выпраўляюць».

**19. с. *Градавая серада. Праводны, Мёртвы, тыдзень.** «Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула».

**20. ч. *Людавы дзень.** Раней у Віленскай губерні білі і качалі яйца з лубкоў, гушкаліся на арэлях. ***Вялікадне мёртвых (Наўскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень, Наўскі чацвер).** Дзень памінання на могілках.

**23. н. *Праводная нядзеля.** «Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла». ***Юры.*** (Новы год па задыяку). «Першае святца — святы Юр'я», «Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на «голы» лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла». ***Войцах.*** «Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху».

**24. пн. *Радаўнічныя Дзяды. Анціп** — ахоўнік зубоў.

**25. а. *Радаўніца.** «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а к вечару скачуць». Марк. «Дождж на Марка, дык зямля як скварка».

**29. сб. Арына.** «На Арыну сей капусту».

**30. н. Зосім** — ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

## Май

**1. п. Кузьма.** «Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком».

**6. сб. Юр'е.** Свята жывёлы. «Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня». Абрад «Страла».

**7. н. *Міраносцы.** «На Міраносця п'янь і бабы цігаюць адна адну за валосця». **Алісей.** «Прыйшоў Алісей — авёс пасей». **Бабскія розбрыкі.** Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.

**8. п.** Пачатак ***Пераплаўнага, Чарвівага, тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві. **Марк.** «Дождж на святога Марка — дык зямля, як скварка». ***Станіслаў.*** «Сей лён на Станіслава — вырасце як лава».

**10. с. *Градавая, Пераплаўная, серада.** Засцярогі ад граду і дажджу.

**13. сб. Якуб.** «На Якуба грэе люба».

**18. ч. Арына Расадніца.** Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

**19. пт. *Градабойцы, Ледавіты дзень** (Віленская губ.).

**20. сб. Антоній.** «На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца дык і прадасца».

**21. н. Іван Веснавы.** Апякун земляроба. «На Івана каласок, а на Пятра піражок».

**22. п. Мікола Веснавы.** Свята пастухоў. ***Алена.*** «Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена».

**23. а. Зілот.** «Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злота».

**24. с. Макей.** «Мокра на Макея — і лета не прасушыць». **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокрае.

**25. ч. **Ушэсце*.** Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта. ***Ушэсце.** Абрад «Страла». Епіфан. «На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета».

**27. сб. Сідары.** «Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы».

**28. н. Пахом.** «Святы Пахом павее цяплом». «Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом».

**31. с. *Градавая серада. Шэсць дзеў.** «Лён сей позні». **Канапелька Матруна.** «У зямлю махнула». **Фядот.** «Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка».

## Чэрвень

**2. пт. *Сёмушныя Дзяды.** Тры пакутнікі. «Няма лета, але пасля іх не бывае зімы».

**3. сб. *Духавая субота, Зялёная субота. Алена, Ульяна.** Дзень ільну.

**4. н. **Сёмуха, Зыход Св. Духа.*** Свята зелені. «На Духа будзе цёпла і суха». ***Сёмуха, Тройца.** Культ продкаў і раслiннасці. «Павядзём Куста пад гай зялёненькі...» **Васіліск.** «Ад Васіліска і салавей блізка».

**5. п. *Русальніца, Іван ды Мар'я.** Праводзіны вясны. «На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...» **Дзень Еўфрасінні Полацкай.** Хадзілі ў Полацк пакланіцца і абракацца.

**6. а. *Конскі Вялікдзень.** Свята коней.

**7. с. *Градабой, серада Русаль.** Здабывалі з ясеня святы агонь. **Ян.** «Рой перад Янам — пчаляр будзе панам».

**15. ч. **Божае цела, Зелянок.* *Дзявятнік.** Перавод уніятаў у праваслаўе. «Дзеўяць ягодзін на ветцы».

**16. пт. *Дзевятуха.** Дзень ад навальніцы. **Лук'ян.** Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

**19. п. *Пятроўка (Петравіца)** Пятроўскі пост да 11 ліп. Пятроўка-галадоўка.

**21. с. *Летняе сонцастаянне*** (з 20.06 да 22.06). ***Даўжыня дня — 16.50. Усход — 4.46, заход — 21.36.*** **Тодар.** «На Тодара раса — канапель паласа».

**22. ч. *Дзясятнік.** «Дзясятнік гнаі возіць». **Кірыла.** Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

**23. пт. *Дзясятка.** «Косы точыць», «Жыта паспявае». ***Купала.*** *У старажытн.* — Новы год/лета.

**24. сб. *Ян Купальны*.** «Сонца грае».

**25. н. Анапрэй.** «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ».

**26. п. Акуліна Грачышніца.** Сеялі грэчку.

**28. с. Амос.** «Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс».

**29. ч. Ціхан.** «Пеўчыя птушкі заціхаюць». ***Пятрок***. «Да Пятра зязюльцы кукаваці», «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два».

## Ліпень

**6. ч. Купалле.** Свята Сонца і кахання. «Дзень адбаўленне, ночы прыбаўленне».

**7. пт. Іван Купала.** «Учора была Купала, а сёння Іван».

**10. п. Самсон.** «На Самсона дождж — сем тыдняў то ж». Сем братоў. «Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды».

**12. с. Пятро.** Свята заканчэння Купалля.

**13. ч. Паўпятро.** Дзень талакі. **Сымон і Юда.** «На Сымана й Юду конь баіцца груду».

**14. пт. Кузьма і Дзям'ян.** Свята кавалёў. «Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сярпы робіць, а святы Дзям'ян сена грабе».

**17. п. Андрэй.** «Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма». «Андрэй усіх мудрэй».

**21. пт. Казанская. Пракоп.** Пракоп бок прыпёк. ***Данат***. «Святы Данат коскі точыць».

**25. а. Прокл.** Засцерагаліся вялікіх рос. ***Якуб***. «На Якуба хлеба поўна губа».

**26. с. Гаўрылей.** Засцеражэнне ад граду. ***Ганна***. Снапы кладзе.

**29. сб. Афінаген.** Заціхаюць птушкі.

**31. п. Серпавіца, Шыпілінка** (пятніца перад Ільёю). Дзень «зазубрывання» сярпоў.

## Жнівень

**2. с. Ілья.** Свята дажджоў і навальніц. «Ілья нарабіў гнілля», «Укінуў у ваду кусок ільда».

**4. пт. Мар'я.** «Магдалена — вады па калена».

**6. н. Барыс Палікоп.** «Барыс і Глеб — паспеў хлеб».

**7. п. Ганны.** «Святыя Ганны бабкі стаўляюць».

**9. с. Палікоп.** Паліць копы. **Панцеляймон.** Вылечваў хваробы галавы.

**11. пт. *Лаўрын*.** «На Лаўрына спяшай да млына».

**14. п. Макавей, Першы Спас.** Свята маку і мёду. **Спасаўка**. Пост да 27 жніўня.

**15. а. Базыль.** «Базыль авечкам воўну дае». ***Прачыстая, Зельная***. «Прыйшла Прачыста — стала поле чыста».

**17. ч. Еўдакія.** Агуркі збірае.

**19. сб. Яблычны Спас.** Свята садавіны.

**23. с. Лаўрэн** — свята млынара.

**24. ч. *Баўтрамей*.** «Св. Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей». «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей».

**27. н. Міхей.** Выспяваюць брусніцы.

**28. п. Прачыстая.** Свята ўраджаю.

**29. а. Трэці Спас.** Свята хлеба. **Ян.** «Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў».

**31. ч. Флор і Лаўр.** Свята коней. **Арабінавыя дзень і ноч.** «Сухая» навальніца, дождж.

## Верасень

**7. ч. Баўтрамей.** «Жыта на зіму сей».

**8. пт. *Другая Прачыстая*.** «Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста».

**10. н. Мацей.** Абаронца ад п'янства.

**11. п. Калінавік, Іван Крываўнік.**

**13. с. Кіпрыян.** Журавель збіраецца ў вырай.

**14. ч. Сымон.** Абрад «жаніцьбы коміна». (Асенняе Навалецце/Навагоддзе з 1493 года). Закрыванне зямлі. **Бабіна лета. *Узвіжанне*.**

**19. а. Цуды, Міхал.** «Міхал з поля спіхаў».

**21. ч. Багач, Нараджэнне Божай Маці.** Свята заканчэння ўборкі збожжа. Засідкі.

**22. пт. *Асенняе раўнадзенства. Усход — 7.01, заход — 19.02.***

**24. н. Тадора.** «На Тадору ўсякае лета заканчваецца».

**26. а. Стаўроўскія Дзяды.**

**27. с. Звіжанне.** Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі — у кучу.

## Кастрычнік

**2. п. Зосім.** Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

**4. с. *Пранцішак, Францішак*.** «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».

**8. н. Сяргей. Жалезны тыдзень.**

**9. п. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў.** Шапталіся сваxі пра нявест.

**14. сб. Пакровы, Трэцяя Прачыстая.** Вясельная пара. «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам». «Пакровы — зарыкалі каровы». **Дзявоцкае лета** (па 21.10). Прымалі «ў дзеўкі» сябровак.

**21. сб. Трыфан, Палагея.** «Золкім ветрам вее». ***Зміцер***. «Да Змітра баба хітра».

**25. с. Марцін** — свята млынароў.

**28. сб. *Сымон і Юда*.** «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць». ***Параскева Пятніцкая.*** Забарона на прадзенне.

**29. н. Лонгін.** Збавіцель ад хвароб вачэй.

**31. а. Лука.** «Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі». Дзень іканапісцаў. ***Юльян*** — ахоўнік дзяцей.

## Лістапад

**1. с. *Усе святыя*.** Памінальны дзень.

**2. ч. *Задушны дзень*.** Памінальны дзень.

**4. сб. Казанская.** Дождж ці снег. **Асяніны, Змітраўскія Дзяды.** «Святыя дзяды, завём вас...»

**8. а. Зміцер.** «Да Змітра дзеўка хітра». Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

**9. с. *Тодар*.** «На Тадора поўна камора».

**10. ч. Параскі.** Апякунка жанчын і рукадзелля.

**11. пт. Настуся.** Настуся стрыжэ авечкі. ***Марцін***. «Мядзведзь кладзецца ў бярлогу».

**12. сб. Артошка.** Пачатак прадзення.

**14. п. Кузьма-Дзям'ян.** Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

**21. а. Міхайлаў дзень.** Абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

**22. с. Матрона.** «З Матроны становіцца зіма».

**24. пт. Хведар Студзянец.** «Хведаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».

**25. сб. Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў. ***Кацярыны***. «Кацярына забрала лета».

**28. а. Піліпаўка.** Перадкалядны пост.

**29. с. Мацей.** «На Мацея зіма пацее».

**30. ч. *Андрэй*.** Дзявочае свята.

## Снежань

**3. н. *Адвент*.** Перадкалядны пост.

**4. п. Увядзенне.** Водзяцца ваўкі. ***Барбара***. «Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла».

**5. а. Пракоп. *Савы*.** «Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае».

**6. с. Матрыхваны.** Не пралі. ***Мікола***. «Хвалі зіму па Міколе».

**7. ч. Кацярыны.** «Забрала край лета».

**9. сб. Юр'е Зімовы.** Юра мосціць. ***Ганны***. «Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні».

**17. н. Варвары.** «Мікола і Варвара ноч урвалі».

**18. п. Савы, Міколін бацька.** «Сава мосце, а Мікола гвоздзе».

**19. а. Мікола Зімовы.** «Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета». «Мікола марозам гвоздзіць».

**22. пт. *Зімовае сонцастаянне. Усход 9.33, заход 16.43.***

**Ганны**. «Ганны — прыбавіцца багата дня», «Ганкі — палічаны дзянькі».

**24. н. *Посная куцця*.** Пачатак Каляд (да 6 студзеня).

**25. п. Спірыдон Сонцаварот. *Божае Нараджэнне.*** Было Новым годам.

**31. н. Марк.** «Марка да Варка — няхай будзе парка». ***Багатая куцця. Сільвестр.*** Варажылі дзяўчаты.

**Складальнік Алесь ЛОЗКА.**

■ Візіт да гастраэнтэролага

# ЁСЦЬ У СТРАЎНІКА ВОРАГ...

**Ешце самі і давайце дзецям натуральныя рыбу і мяса, гародніну і фрукты, мёд і арэхі. Гэта будзе ідэальнай прафілактыкай вялікай колькасці захворванняў, наўпрост звязаных з тым, што і як мы ядзім, у першую чаргу сардэчна-сасудзістых і анкалагічных. Заадно і органы стрававання зберажом, тую ж печань.**



На долю захворванняў печані ў структуры смяротнасці ад гастраэнтэралагічных захворванняў прыпадае каля 50-55 працэнтаў, а ў працаздольным узросце — і таго больш: каля 65. Ратаваць печань — значыць, не быць ворагам самому сабе. Не злоўжываць алкаголем (або наогул не ўжываць яго), не дапускаць празмернага набору вагі, атлусцення, заражэння вірусамі гепатытамі (або своечасова праводзіць іх лячэнне). Як бачна, першыя два пункты дакладна звязаны з тым, што і як мы ядзім ды выпіваем.

**Лад жыцця і харчавання — самае простае, пра што могуць клапаціцца бацькі, пачынаючы ад моманту нараджэння. Дзецям першага году жыцця неабходна грудное кармленне. Грудное малако ніколі нішто не заменіць.**

А вось такое сур'ёзнае захворванне, як рак страўніка (па распаўсюджанасці гэтага віду анкалогіі Беларусь знаходзіцца ў шэрагу першых у Еўропе), абумоўлена не столькі, скажам, якасцю прадуктаў, колькі нашым уяўленнем аб гігіенічных нормах і адпаведнымі паводзінамі ў быце. **Асноўным фактарам рызыкі развіцця раку страўніка з'яўляецца бактэрыя хелікабактар пілары — ёю інфікаваны, паводле прыблізных ацэнак, да 80 працэнтаў дарослага насельніцтва Беларусі (у Еўропе і ЗША — 30—40 працэнтаў).**

Большасць людзей пры гэтым не адчуваюць ніякіх сімптомаў, аднак наяўнасць інфекцыі можа прывесці спачатку да ўзнікнення язвы страўніка, а пазней і да раку. Рэакцыя на гэту бактэрыю ў кожнага свая, акрамя таго, ёсць штамы больш ці менш патагенныя. Аднак пакуль не абследуешся, не даведаешся. Прычым абследаваць пажадана ўсіх членаў сям'і. Цесныя бытавыя кантакты звычайна спрыяюць перадачы бактэрыі ад адных дарослых іншым і ад дарослых — дзецям. Дакладныя шляхі перадачы інфекцыі ў нашай краіне не вывучаліся, але наогул з яе распаўсюджваннем звязваюць парушэнне элементарных правілаў асабістай гігіены. Заўважана, што высокі ўзровень жыцця, выкарыстанне мыечных машын для посуду, актыўнае выяўленне і лячэнне інфекцыі спрыяюць зніжэнню выпадкаў яе з'яўлення ў папуляцыі. Айчынныя спецыялісты заўважаюць, што значэнне могуць мець і іншыя «дробязі». Напрыклад, імкненне нашых людзей палячыцца ў стацыянарах. Атрымаць любую інфекцыю значна прасцей сярод аслабленых, хворых людзей. А наша злоўжыванне антыбіётыкамі прывяло да таго, што ўсе інфекцыі, у тым ліку і гэту, лячыць стала цяжэй. Раней лячэнне прызначалася на адзін тыдзень, а цяпер на два, прычым выкарыстоўвацца могуць тры антыбіётыкі адначасова.

— Выявіць хелікабактар можна з дапамогай дыхальных тэстаў, — адзначае **дацэнт кафедры гастраэнтэралогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, галоўны пазаштатны гастраэнтэролаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук Юлія ГАРГУН.** — Адзін з іх мае дакладнасць вышэй за 95 працэнтаў. Аналіз выдыхнутага пацыентам паветра праводзіцца з дапамогай спецыяльнага абсталявання замежнай вытворчасці. Гэты апаратны метад прымяняецца ва ўсім свеце. А вось для другога метаду — расійскай дыхальнай тэст-сістэмы — дакладнасць не ўстаноўлена.

Недахоп абодвух варыянтаў у тым, што яны не дазваляюць зрабіць выснову адносна тых пашкоджанняў, якія пакінула ў страўніку бактэрыя, а таму імі карыстаюцца не столькі з мэтай дыягностыкі, колькі для ацэнкі эфектыўнасці праведзенага лячэння хелікабактарнай інфекцыі. Першы апаратны тэст ёсць у 10-й сталічнай бальніцы, кансультацыйна-дыягнастычным цэнтры, медцэнтры МТЗ, Мінскай абласной бальніцы, а таксама ў кожнай вобласці — абласной бальніцы ці абласным дыягнастычным цэнтры. Не рэкамендуецца выконваць з мэтай дыягностыкі аналіз крыві — ён падыходзіць толькі для пярвічнай дыягностыкі ў асаблівых выпадках. **А самым аптымальным метадам даследавання, у тым ліку ў якасці кантролю лячэння, была і застаецца гастраскапія з біяпсіяй.**

**Наша злоўжыванне антыбіётыкамі прывяло да таго, што ўсе інфекцыі, у тым ліку і гэту, лячыць стала цяжэй. Раней лячэнне прызначалася на адзін тыдзень, а цяпер на два.**

Паталогіямі органаў стрававання займаюцца ў першую чаргу ўрачы-тэрапеўты, якія пры неабходнасці накіроўваюць да гастраэнтэролагаў. Самая высокая даступнасць гастраэнтэралагічнай дапамогі — у сталіцы, дзе такія вузкія спецыялісты працуюць у некаторых паліклініках і кансультацыйна-дыягнастычным цэнтры. Па накіраванні або на платнай аснове даступныя прафесіяналы спецыялізаваных аддзяленняў 2-й, 3-й, 6-й, 9-й і 10-й бальніц, а на базе апошняй працуе Рэспубліканскі гастраэнтэралагічны цэнтр. Гастраэнтэролагі ёсць ва ўсіх абласцях, але не ва ўсіх раёнах.

— «Дарослыя» захворванні органаў стрававання сустракаюцца сёння і ў дзяцей — тлушчавыя пашкоджанні печані, гастраэзафагеяльная рэфлюксная хвароба, запаленчыя захворванні кішэчніка, неспецыфічны язвавы каліт. Бескантрольнае лячэнне дзяцей антыбіётыкамі прывяло да росту колькасці выпадкаў дысбіёзу кішэчніка, — заўважае **дацэнт 2-й кафедры дзіцячых захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Ірына САВАНОВІЧ.**

Лад жыцця і харчавання — самае простае, пра што могуць клапаціцца бацькі, пачынаючы ад моманту нараджэння. Дзецям першага году жыцця неабходна грудное кармленне. Грудное малако ніколі нішто не заменіць. У педыятрыі існуе панятак першай тысячы дзён жыцця. Як харчуецца будучая мама, якія харчовыя звычкі ў яе ёсць, ці кормяць пазней дзіця з улікам узроставых патрабаванняў або толькі з агульнага стала — усё гэта фарміруе харчовыя перавагі, уплывае на здароўе ■

■ Рэжым дня

# КАЛІ НЕ МОЖАШ ЗАСНУЦЬ

## Дрэнны сон мае для арганізма тыя ж наступствы, што і стрэс

**Спрыяе набору вагі, зніжае імунітэт і працаздольнасць, абвастрае хранічныя захворванні. Эксперыменты паказваюць, што некалькі дзён без сну спрыяюць развіццю тых жа працэсаў паскоранага старэння, што маюць быць і падчас стрэсаў.**



«Вельмі важным паказчыкам сну будзе не столькі нават яго працягласць, колькі якасць — тое, наколькі глыбока, спакойна, моцна мы спім, — расказвае **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Наталля СТАТКЕВІЧ.** — Засынаць мы павінны хутка і лёгка, спаць без начных пабудак, абуджацца раніцай свабодна і лёгка. Забяспечце сабе для гэтага некалькі ўмоў».

Абавязкова трэба выдаліць шум. Пад спальню неабходна адвесці самы ціхі пакой.

Тэмпература ў пакоі павінна быць на ўзроўні 15—18 градусаў. Калі спаць у надта цёплым памяшканні, то тэмпература цела не зможа панізіцца да аптымальнага ўзроўню, а калі надта холадна, то цела ўключыць абагрэў. У абодвух выпадках мы не дасягнем аптымальнай для сну тэмпературы. Забраўшыся пад коўдру, трэба адчуваць камфорт — не мерзнуць і не пацець.

Вільготнасць паветра — 45—55 працэнтаў. Надта сухое паветра перашкаджае дыханню. Летам лепш спаць з адчыненай фортачкай, а зімой абавязкова праветрывайце спальню на ноч.

Кладзіцеся першым або спіце ў розных пакоях. Інакш не дапамагчы таму, хто пакутуе ад шумнага партнёра побач, які можа варочацца, храпці або скрыгатаць зубамі ў сне.

Падбярыце сабе добрае месца для сну. Ложак, матрац, падушка і г.д. — усё павінна падабацца і спрыяць сну.

Нават у выхадныя трэба вытрымліваць рэжым. Кладзіцеся і ўставайце ў адзін і той жа час. Цела будзе адгукацца на такую звычку.

Распарадак дня. Калі вам трэба рана прачынацца, не пакідайце сур'ёзныя, цяжкія справы на вечар. Наўрад ці гэта паспрыяе расслабленню.

Захоўвайце актыўнасць. Цягам дня мы павінны быць бадзёрымі і стаміцца бліжэй да вечара. Хадзіце па лесвіцы пешшу, займайцеся фізкультурай, але не перад самым сном, а за гадзіну-дзве як мінімум.

Калі спаць днём, то зусім крыху. Можна дазволіць сабе часам дзённы сон, але не даўжэй як на 30 хвілін, інакш пагоршыце сон начны.

Знайдзіце раўнавагу. Увесь стрэс павінен застацца за дзвярыма спальні. Пасля вячэры зрабіце лёгкую дыхальную гімнастыку ці штосьці ў тым родзе. Нейкі рытуал павінен настроіць цела і дух на адпачынак.

Ложак — не чытальня. Мы можам запраграмаваць сябе на добры сон, калі не будзем рабіць з ложка рабочае месца або чытальную залу. Калі не атрымаецца заснуць, лепей падняцца і пашукаць сабе які-небудзь занятак. Як толькі адчулі, што захацелася спаць, ідзем і кладземся.

Падымаемся з будзільнікам. Калі рабіць па прынцыпе «яшчэ крышачку», гэта значыць, зноў правальвацца ў лёгкі сон. Гэта не дазволіць як след «даспаць», а проста парушыць рытм сну.

Святло дапаможа прачнуцца. Асабліва святло сонечнае. Праўда, зімой з гэтым праблема. Добрая альтэрнатыва — свежае паветра і рух.

Бадзёрасць павінна быць эфектыўнай. Ранні пад'ём павінен суправаджацца актыўнай дзейнасцю, якая прыносіць максімальную карысць і вынік. Калі не запоўніць справамі ранішні час пасля ранняга пад'ёму, мозг проста не зразумее, для чаго трэба было прачынацца так рана.

Невялічкі перакус перад сном не нашкодзіць. Аптымальны час для прыёму ежы — 18—19 гадзін, самае позняе — за дзве гадзіны да сну. Непажадана ўжываць простыя вугляводы і вельмі тлустую ежу.

Ад кавы ўвечары дакладна трэба адмовіцца. Замяніце кафеін на напоі, якія сапраўды заспакойваюць. Напрыклад, малако з невялічкай колькасцю мёду. Не ўжывайце алкаголь — гэта пагоршыць якасць сну. Сон будзе неглыбокім, з частымі прачынаннямі. Непажадана захапляцца наогул вялікай колькасцю вадкасці: уставаць сярод ночы ў прыбіральню — значыць, прыпыніць сон.

Нікацін стымулюе гэтаксама, як і кафеін. Так што не курыце перад сном, калі не сказаць, не курыце зусім і ніколі.

Памятайце, што ўсе мы вельмі розныя. Таму не ўсе рэкамендацыі спрацуюць менавіта ў вашым выпадку. Аднак усё вышэйпералічанае сапраўды здольнае значна палепшыць сон, калі толькі размова не ідзе пра вельмі сур'ёзныя парушэнні. Калі яны маюць глыбокую прыроду і не праходзяць доўгі час, звярніцеся па кансультацыю да спецыяліста ■

■ Трывожны сімптом

# Менш кафеіну, даўжэй прагулкі

## У галавакружэння — больш за восемдзесят прычын

**Звычайна яны бяскрыўдныя — празмерная стомленасць, закалыхванне, голад або проста серныя пробкі ў слыхавым праходзе. Але ў некаторых выпадках гэта можа быць прыкметай сур'ёзнага захворвання.**



Чым дапамагчы таму, каго напаткала такая непрыемнасць? Па-першае, трэба пакласці гэтага чалавека так, каб плечы, шыя і галава былі на адным узроўні. Патлумачце яму, што варушыць галавой нельга, што вочы павінны быць расплюшчанымі, глядзець трэба ў адну кропку, дыхаць павольна і глыбока. Адчыніце акно, пакладзіце на лоб хворага змочаны халоднай вадой ручнік, забяспечце цішыню і спакой, памерайце артэрыяльны ціск, пульс і тэмпературу цела. Дайце выпіць цёплай вады.

Аднак калі мела месца страта прытомнасці, тым больш з траўмай галавы, ваніты або млосць, рэзкія скачкі ціску, парушэнне маўлення, і пры гэтым ёсць праблемы з сэрцам або цукровы дыябет, калі прыступ доўжыцца больш за гадзіну, трэба выклікаць хуткую або звярнуцца да ўрача.

Для лячэння прымяняюць некалькі груп медпрэпаратаў, фізіятэрапію, псіхатэрапію, прымяняюць спецыяльную гімнастыку, практыкаванні для дыхання. Трэба адмовіцца ад курэння і алкаголю, недасольваць ежу, знізіць да мінімуму ўжыванне кафеіну, не перадаць, не рабіць рэзкіх рухаў галавой і шыяй, не падымацца рэзка з ложка, пазбягаць душных памяшканняў, стомленасці, стрэсаў, штодня гуляць на свежым паветры, асабліва перад сном.

— Галавакружэнні могуць з'яўляцца, напрыклад, пры рэзкай змене становішча цела, захворваннях шыйнага аддзела пазваночніка, запаленнях унутранага вуха, у пажылых — на фоне артэрыяльнай гіпертэнзіі, атэрасклерозу, васкуліту, анамаліі сасудаў, цукровага дыябету, ішэмічнай хваробы сэрца, арытміі, — тлумачыць **урач-неўролаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Юлія ВАРАНЬКО.** — Акрамя таго, гэта характэрна для эмацыянальна няўстойлівых асоб пасля недасыпання або празмернай стомленасці. Галавакружэнне звязана і з інтаксікацыяй тытунём, алкаголем, наркарэчывамі, медпрэпаратамі, якія паніжаюць ціск, антыбіётыкамі, дыўрэтыкамі, антыгістамміннымі і іншымі прэпаратамі.

Для абследавання ўрач можа прызначыць аналізы крыві, электракардыяграму, рэнтген шыйнага аддзела пазваночніка, ультрагук брахіяцэфальных сасудаў, па паказаннях прызначаецца яшчэ шэраг спецыфічных даследаванняў ■

■ Дзеля дзіцяці

# Цяжарным нельга ні віна, ні піва

**Штораз трапляючы ў арганізм маці, алкаголь, нікацін або любое наркатычнае рэчыва згубна адбіваецца на будучым дзіцяці. Апошнія даследаванні заходніх вучоных паказваюць, што ўсё пералічанае можа паўплываць на фарміраванне галаўнога мозгу, а што такое галаўны мозг, тлумачыць дадаткова і не варта.**

— Курэнне застаецца адной з самых распаўсюджаных шкодных звычак як сярод дарослых жанчын, так і сярод маладых цяжарных, — расказвае **ўрач акушэр-гінеколаг, загадчыца жаночай кансультацыі 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Алена ЯРАШ.** — Жанчыны, напэўна, не ўсведамляюць, што такім чынам павялічваюць рызыку неспрыяльнага зыходу цяжарнасці ў два разы. Выкураная цыгарэта правакуе спазм сасудаў, а таму плод нейкі час знаходзіцца ў стане кіслароднага галадання. Пазней такія дзеці слабыя, цяжка адаптуюцца, шмат хварэюць. У маёй практыцы быў выпадак, калі мы ўгаворвалі цяжарную легчы ў стацыянар і не маглі зразумець яе актыўнае супраціўленне. Нарэшце яна прызналася, што там не выпускаюць на вуліцу і няма магчымасці пакурыць. На пытанне, як жа яна збіраецца без курэння перанесці роды, якія могуць цягнуцца больш за 12 гадзін, жанчына толькі паціснула плячамі.



Любому, хто сочыць за сваім здароўем, тым больш будучай маці, трэба наогул засцерагацца нават ад пасіўнага курэння. Пад забаронай не толькі моцны алкаголь, але і піва, і віно, ва ўжыванні якіх многія цяжарныя наогул не бачаць ніякай пагрозы. Маўляў, невялікая колькасць не нашкодзіць. Аднак, па-першае, ніхто з нас не ведае свой арганізм настолькі, каб дакладна вызначыць, а колькі менавіта алкаголю будзе для яго бясшкодным. Для некага і 5 г могуць быць недапушчальнымі. Прадукты паўраспаду алкаголю валодаюць таксічным уздзеяннем, у тым ліку на плод. Нягледзячы спіртное забараняецца і падчас цяжарнасці, і нават на этапе яе планавання. І, што немалаважна, гэта рэкамендацыя дзейнічае для будучага таты таксама!

Вядома, што пастаяннае ўжыванне алкаголю на працягу ўсёй цяжарнасці спрыяе развіццю ў дзіцяці алкагольнай залежнасці. Такія дзеці потым пакутуюць ад нізкай вагі, разумовай адсталасці, маюць праблемы са зрокам і слыхам, у іх спецыфічны твар.

Любое наркатычнае рэчыва таксама лёгка пранікае праз плацэнту і разносіцца з крывёю па арганізме. Прычым некаторыя наркотыкі могуць затрымлівацца ў арганізме плода нашмат даўжэй, чым у маці. Мала таго што такія дзеці маюць незлічоную колькасць праблем у развіцці, яны яшчэ ад самага пачатку — нарказалежныя ■

■ Псіхалогія для ўсіх

# МІЛЫЯ СВАРАЦЦА...

## У сямейных канфліктаў ёсць і рэальныя прычыны, здольныя прыводзіць да краху

**Канфлікт нельга разглядаць як адхіленне ад нармальных паводзін — гэта від стасункаў, эмацыянальная спроба выявіць нейкія супярэчнасці. Так што і для сем'яў канфлікты — справа звычайная, ва ўсіх бываюць. Праблема зусім не ў тым, ці ёсць яны ўвогуле, а ў тым, што вы робіце для іх вырашэння і папярэджвання.**

Нейкіх фармальных падстаў для пачатку сваркі можа быць шмат — абед нясмачны, дзіця дрэнную адзнаку ў школе атрымала, кажам не тое, робім не гэта... А вось рэальных прычын канфлікту існуе вельмі мала, і яны даўно вывучаны. Разглядзім усё ж такі галоўныя. Пры гэтым адкрытую палігамнасць аднаго з партнёраў, зазіранні ў бутэльку, ужыванне наркотыкаў і схільнасць да азартных гульняў разглядаць не будзем, бо вырашыць такія праблемы без спецыялістаў амаль немагчыма.

**1. Паспешлівасць.** Самыя частыя спрэчкі ўзнікаюць у пар, якія пажаніліся неабдумана, з прычыны першай захаханасці, цяжарнасці, страху страціць любага. Калі страсці сціхаюць, дзіця падрастае і ўжо ніхто нікуды не сыходзіць, высвятляецца, што паміж гэтымі двума вельмі мала агульнага, яны наогул адзін аднаго абсалютна не ведаюць. Так і пачынаюцца сваркі «на роўным месцы».

**2. Фінансавыя праблемы.** Калі ў сям'і штодня не хапае грошай, няма нармальнага жылля або магчымасці набыць штосьці вельмі неабходнае, гэта абумовіць дэпрэсію ў кожнага члена сям'і. Пастаянная незадаволенасць узроўнем жыцця рана ці позна выліваецца ва ўзаемныя абвінавачанні і спрэчкі. Вельмі добра, калі фінансавыя праблемы моцна павярнуць так, каб згуртаваць сям'ю вакол іх вырашэння, але часцей бывае наадварот.

**3. Стасункі з бацькамі.** Мама і тата — самыя дарагія для кожнага з нас людзі, і калі яны ўмешваюцца ў справы жанатых дзяцей, то канфлікт паміж апошнімі непазбежны.

Частыя пераезды, камандзіроўкі і вельмі напружаны графік работы — усё, што перашкаджае праводзіць час разам — таксама не спрыяе згуртаванню сям'і.

Самыя канфліктныя перыяды, калі неабходна асабліва ўважліва ставіцца да сябе і другой паловы — гэта першы год суменснага жыцця і нараджэнне першынца. Менш небяспечныя канфлікты ўзнікаюць пры іншых вялікіх зменах — нараджэнні новага дзіцяці, змене месца працы, падрастанні дзяцей (асабліва пераходны перыяд), выхадзе партнёраў на пенсію...



— Адны канфлікты разбураюць сем'і, іншыя ўмацоўваюць. Існуе ўсяго тры спосабы выхаду з канфлікту — пазбяганне, кампраміс і супрацоўніцтва, — тлумачыць **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Ірына ГАРБАНАВА.** — Самае важнае, не дапускаць напружання, якое вымотвае, прыводзіць да выбуху эмоцый, адчужэння і развалу сям'і. Калі штосьці ідзе не так, як хацелася б, трэба размаўляць, і гэта павінна быць шчырая размова. Нават калі вы перакананыя ў сваёй праваце, трэба выслухаць усіх зацікаўленых. Не пераконвайце ўсіх у сваёй праўдзе, а разам шукайце выйсце. Неабходна прыняць агульнае рашэнне, і правілаў выхаду з канфлікту далей павінны трымацца ўсе...

канфлікту. Адмоўцеся ад эгаізму і ўпартасці. У нашых партнёраў таксама ёсць сваё меркаванне, пачуццё ўласнай годнасці, планы і жаданні. Шукайце агульнае. Гэта ў інтарэсах любога. Схаваная агрэсія прыводзіць не толькі да распаду сям'і, але і да шматлікіх захворванняў.

✓ Калі адчуваеце, што ўнутры ўсё «закіпае» і хочацца сказаць нешта крыўднае, палічыце да дзесяці, а пакуль лічыце, прыгадайце, што гэтага чалавека вы самі выбралі сабе ў спадарожнікі жыцця, вы марылі пражыць жыццё разам. Цяпер пачынайце гаварыць.

### І яшчэ...

✓ Не ідэалізуйце партнёра. Прымайце ў людзях і іх недахопы. Мы ўсе розныя, і без талерантнасці не абысціся.

✓ Нельга пачынаць сварку, калі вы проста нязгодныя ў дробязях.

✓ Нельга абражаць і максімальна чапляць другі бок

### Гэта ўсё Я!

Дзякуючы гэтаму практыкаванню, можна прааналізаваць сваю асобу, што паспрые падтрымцы талерантных стасункаў з навакольнымі.

Вазьміце ліст паперы і падзяліце на квадраты такім чынам:

| | |
|---|---|
| 1 | 2 |
| 3 | 4 |

У квадраце 1 напішыце 5 якасцяў, якія вам у сабе падабаюцца (можна адным словам, кшталту «надзейны», а можна і так: «умею слябраваць»).

У квадраце 3 напішыце 5 вашых якасцяў, якія вам не падабаюцца ў сабе.

Цяпер перафармулюйце якасці з квадрата 3 так, каб яны пачалі выглядаць як станоўчыя. Для гэтага можаце ўявіць, як гэтыя якасці назваў бы іншы чалавек, які вас вельмі любіць і якому падабаецца ў вас усё. Запішыце гэтыя перафармуляваныя якасці ў квадраце 2.

Далей уявіце, што вас хтосьці вельмі не любіць і таму нават вашы станоўчыя якасці ўспрымае як адмоўныя. Перарабіце якасці з квадрату 1 з пункту гледжання вашага злога ворага і запішыце ў квадраце 4.

Прыкрыйце далонню квадраты 3 і 4, паглядзіце на квадраты 1 і 2. Бачыце, які цудоўны чалавек атрымаўся! Паглядзіце затым на квадраты 3 і 4. Жудасная карціна: хто захоча мець стасункі з такім чалавекам?

На самай справе ўсё гэта — вы! Вы апісалі адны і тыя ж якасці, толькі з пункту гледжання сябра і ворага. Намалюйце ў цэнтры вялікую літару «Я» і прыгадвайце гэты малюнак часцей.

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА. protas@zviazda.by

■ Простая мова

# ЧАРОЎНАЯ СІЛА... СМЕХУ

**Добра бабулі: згубіла рукавічку, — села і звязала новую, прычым з задавальненнем, бо яна ўмее і любіць вязаць.**
**А нейкая іншая — шыць і вышываць, маляваць, гатаваць, вырошчваць гародніну...**
**Дзядулі ў іх таксама не зломкі: гора навучыла каго цяслярыць, каго пчол даглядаць, каго плесці кашы... Факт, што многія занятак маюць — справу для душы.**
**Цікава, што на заслужаным адпачынку будзе рабіць сучасная моладзь — па-ранейшаму сядзець у інтэрнэце?**

## Ім не дагодзіш

Раніца. Кухня. Сняданак. За сталом — трое.

— Томачка, нешта сёння чай не такі? — нясмела пытаецца муж.

— Яшчэ што выдумай! — абураецца жонка. — Чаму гэта ён не такі? Пі давай!

Муж, бедны, моршчыцца, крывіцца, але ж п'е. Што праўда — не ўвесь, бо ўрэшце ўсё ж адсоўвае свой кубак, дзякуе за сняданак і вылазіць з-за стала.

Жонка застаецца: сядзіць, дапівае сваю гарбату, каштуе («Ну што яму не так?») мужаву і тут жа... выплёўвае, бо чай страшэнна... салёны.

Гэта яна так «пасаладзіла», гэта яна «прамахнулася» лыжачкай. Але ж вінаваты ўсё роўна муж, бо...

— Ну, не мужык ён! Дальбог! — наракае кабета. — Мужык — той салёную гарбату не піў бы! І не змаўчаў бы... Ён хоць адзін раз узяў бы ды стукнуў кулаком па стале! А гэты... Цямця-лямця ён, недарэка... Ну праўда ж?

Трэці з застольнікаў, які ўсё гэта бачыў і чуў, у вочы ёй адказаў:

— Праўда.

А потым за вочы дадаў:

— Ліхая жонка ў хатцы, як скула на...

Вы здагадаліся, дзе?

## Паралелі

Некалі з асалодай чытала кнігу Алякся Карпюка «Развітанне з ілюзіямі». Цяпер — ці не з такой жа — чытаю Уладзіміра Познера: ён таксама развітваецца — ужо са сваімі, шчыра, як на духу, расказвае пра сябе, пра час і Расію.

Адзін эпізод, прычым з шараговых: недзе ў 2005-м (дванаццаць гадоў таму) спадар Познер прыляцеў з Масквы ў Нью-Ёрк і па дарозе ў гатэль заўважыў, што знік яго пашпарт.

Назаўтра ж ён паведаміў пра гэта ў Пашпартны цэнтр і далей досыць падрабязна апісвае, да каго там звяртаўся, колькі чакаў, на якім паверсе і ў якім акенцы запаўняў прапанаваны бланк, як здабываў ксеракопію дакумента аб грамадзянстве, а потым высветлілася, што патрэбен арыгінал, а той у Маскве і туды не вылецiш без пашпарта... На вось гэта яму адказалі, што ёсць яшчэ адзін арыгінал — у Вашынгтоне, і яго прышлюць адтуль, але тое будзе каштаваць 90 долараў.

Чалавек без пашпарта згадзіўся б заплаціць куды болей! І наступным разам прыйсці праз тыдзень ці нават праз месяц...

Яму прызначылі сустрэчу на 15 гадзін таго самага дня і роўна ў 15 напрасілі распісацца — у атрыманні... новага пашпарта. «Сэр, я не магу падабраць словы, каб выказаць вам сваю ўдзячнасць за такую работу, — сказаў яго ўладальнік. — Я вельмі ўражаны!»

На што чыноўнік — трэба разумець, не бачачы ў тым нічога незвычайнага — вельмі сур'ёзна адказаў: «Сэр, вы плаціце за гэта падаткі».

Мы — у Беларусі, у Расіі — іх плацім таксама.

Цікава, за колькі дзён тут аднавілі б страчаны пашпарт?

## Героі нашага часу

Ніначка *возіць* экскурсіі — па розных гарадах ды мястэчках.

Пехам, бывае, *водзіць* таксама: найчасцей — па цэнтры сталіцы, па вуліцах Маркса (былой Падгорнай), Энгельса (Дамініканскай), Леніна (Францысканскай ды Губернатарскай)... І расказвае тады, і паказвае, і пытае...

Надоечы, напрыклад — у дзяцей:

— Што вы ведаеце пра Леніна?

Аказалася, што ніхто і нічога. А калі дакладней — адзін хлопчык і адзін анекдот, праўда, пра дзвюх сястрычак, што жылі на вуліцы Леніна. І старэйшая гэтым вельмі ганарылася, а малодшая наадварот — плакала, таму, што Леніна вуліца ёсць, а вось яе, Свецінай — чамусьці няма.

## Каб ведалі...

Горад, майстэрня, надпіс на сцяне:
«Хочаш дапамагчы малому —
зрабі разам з ім,
Хочаш дапамагчы старому —
зрабі замест яго,
Хочаш дапамагчы майстру —
не замінай,
Хочаш дапамагчы дурню — сам такі».

Як быццам новага тут нічога — прапісныя ісціны. Але ж нехта сфармуляваў іх?

І тым самым «узброіў» іншых — на першы погляд элементарным: веданнем, як жыць.

## Шчаслівы сабачка

Раней на тым падворку жыўнасці было незлічона — каровы, цяляты, авечкі, свінні, куры, гусі... Цяпер, на жаль, не тыя гады, не тыя і сілы: хіба што куры засталіся ды два каты.

— А вы яшчэ сабачку малога ўзялі б, — раіць гаспадыні пяцігадовая суседка.

— Не, дзіцятка, — адмаўляецца тая, — яго ж выхоўваць трэба, даглядаць, нечым карміць...

— Гэта — хіба раніцай, — з веданнем справы тлумачыць дзяўчынка. — А днём кавалак каўбасы яму кінеце, дык ён і пад'есць...

Хто б сумняваўся?

## «А в остальном, прекрасная маркиза...»

На бюджэтную форму навучання Паліна не паступіла, вучыць на платным — бацькі не ўзяліся: пайшла працаваць — прадавачкай у маленькую прыватную краму, касіркай, афіцыянткай.

Вось гэта (як потым даўмелася) найбольшай памылкай было, бо якраз тады ёй спадабаліся лёгкія грошы і прыгожае жыццё, якраз там, маючы звычку ўсё заядаць і запіваць, яна моцна распаўнела (каб пахудзець, нейкі дурань параіў курыць, яна ўзялася, потым пераканалася, што марна, але кінуць ужо не змагла)... Да таго ж, якраз там, у сваім рэстаране, яна пазнаёмілася і на 12 доўгіх гадоў сышлася з хлопцам, які ўрэшце ажаніўся з іншай...

Зрэшты, жыццё ёсць жыццё. У кожнага яно сваё і кожнага хоць некуды ды ўрэшце выводзіць: Паліна атрымала-такі спецыяльнасць, знайшла працу і нават займела аўтарытэт. Ва ўсякім разе непасрэдны начальнік не раз называў яе сваёй правай рукой... Што не магло не цешыць!

Для засмучэння, праўда, таксама падстава была, бо з часам дзеўка стала заўважаць, што нагружаюць яе ўсё больш і больш, а вось плацяць — якраз наадварот.

Спачатку гэта проста здзіўляла яе, потым — абурала (бо няма ж ніякай справядлівасці!), а ўрэшце — вылела з сябе, прычым настолькі, што закаціла істэрыку, кінула на стол заяву на звальненне...

Спадзявалася, што правільна ўсё зразумеюць і гэту паперу, вядома, не падпішуць, бо не дурань жа той начальнік — не будзе ён сякчы сваю правую руку?

А той — як потым сказалі — нават вокам не міргнуў, тут жа звольніў («па пагадненні бакоў»)...

Стрэс яшчэ той быў: курыла цыгарку за цыгаркай, гарала, без снатворнага не спала, спрабавала піць. І паралельна (жыць жа за нешта трэба!) — шукаць сабе новую работу: рассылаць рэзюмэ, ездзіць да патэнцыйных працадаўцаў. Хоць і без толку (ва ўсякім разе, пакуль), бо хутка пераканалася, што зараз на больш-менш прывабныя месцы не проста *набіраюць* спецыялістаў... Іх найперш *выбіраюць* — з ліку маладых, прыгожых, дыпламаваных, пажадана — здаровых (не знерваваных), без шкодных звычак.

У дзеўкі ўсё гэта было, але... у мінулым стагоддзі.

Што засталося ў гэтым?

Досыць яснае разуменне таго, што жыццё чалавека ці не тая ж бегавая дарожка. І калі на ёй прамарудзіць — не рвануцца з месца ў кар'ер альбо недзе адстаць — то потым ужо не дагоніш, бо... не паспееш: кароткая дужа дыстанцыя.

А яшчэ — пачуццё гумару: ва ўсякім разе на пытанне, як справы, яна адказвае сваім пытаннем:

— Вам праўду сказаць?

— Пажадана.

— А мацюкацца можна?

— Не хацелася б...

— Тады — усё добра.

## І ты, Брут?

У грамадскім транспарце некалі прасцей было: праязны — звычайны, папяровы — на месяц купіў, у сумку палажыў і спакойна ездзіш — пра нешта думаеш, на людзей глядзіш альбо чытаеш. Цяпер жа...

— Ваш праязны, — зніча ўку гучыць над вухам.

Спехам згортваю газету, дастаю білет, прыкладваю да нейкага кантралёрскага «валідатара» і тут жа ўспамінаю, што, заходзячы ў салон, забылася яго «адзначыць».

Жанчына выпраўляе гэтую хібу (ёй балазе няцяжка ды і «служба»...), але ж пры гэтым строга павучае, што ў грахах сваіх трэба прызнавацца адразу.

...Яшчэ і кантралёру?

## Месца, дзе хочацца жыць

Хатка была невялічкая, старэнькая...

Мусіць, таму пасля смерці бацькоў прадаваць яе дзеці не сталі: пакінулі сабе, у якасці прыстанку — на той выпадак, напрыклад, калі з'едуцца на могілкі, альбо калі нехта захоча прыехаць у вёску, пахадзіць у грыбы...

Меркавалася так. Атрымалася — трохі інакш: аўдавеўшы, сюды, на бацькаўшчыну, вярнуўся адзін з сыноў. Здаў гарадскую кватэру, памяняў у хаце гнілыя падрубы, абрэзаў сад, пасадзіў гарод, завёў ката і сабаку...

Надоечы ён у Мінск прыязджаў, каб з кватарантаў грошы ўзяць. У двары былыя дружбакі спынілі. Угаварылі выпіць, пагаманіць, як некалі, па душах — памянуць ягоную Людку, а потым — і застацца тут, у горадзе, у камфорце, ну хаця б на зіму...

— Не і яшчэ раз не, — сказаў удавец, — бо тут, з вамі, я праз месяц-другі загнуся. А там, дасць Бог, яшчэ пажыву — падыхаю лесам, пахаджу па зямлі, сабаку свайго пагладжу.

...Слова *прыстанак*, *прыстанішча*, паводле слоўніка — месца, дзе можна прыстаць, прыпыніцца, *прытуліцца*.

І найлепш, відаць, на радзіме?

## Чароўная сіла... смеху

Загаворы ў Мінску — на вакзале, у краме, у трамваі — па-кітайску ці па-японску, на цябе хіба вокам кінуць. Загаварыў я (як мы з калегам) па-беларуску — «усе вушы тут». І вочы, здаецца, таксама. Ва ўсякім разе дзядзька, што расселся паблізу, глядзіць, не міргаючы, ловіць кожнае слоўца і пасля чарговага ўсё ж зрываецца:

— Вы, канешна, звіняйце, — кажа на ўсю пляцоўку трамвая, — але я ў беларускай школе вучыўся, у дзярэўні рос, і так, як вы, там ніхто не разгаварываў... «Насамрэч» ды «насамрэч»... Тожа мне — словы прыдумалі... А што яно азначае, калі з трох часцей састаіць: на, сам і рэч. *Вешч*, кажучы па-руску! А прычым тут яна?!

Дзядзька абураны, дзядзька пытае і (гэта відавочна) чакае адказу.

А што яму сказаць (тым больш — нам хутка выходзіць)? Што ягоная вёска і ягоная школа — гэта мінулае стагоддзе (як мінімум, канец шасцідзясятых) і што гэта яшчэ не ўся Беларусь? Што словы *насамрэч* (і нават *насамперш*) у мове ёсць і што дзяліць іх на часткі (а тым больш перакладаць) не трэба...

Рой думак — у мяне. У калегі, як бачу — толькі ўсмешка:

— Скажыце, — звяртаецца ён да дзядзькі, — а ці было ў вашай вёсцы слова *ўпоперак*?

— А як жа, было, — ганарыцца той. — І *ўздоўж* было, і *ўпоперак*...

— А яго падзяліць вы не спрабавалі?

— Не, — нічога не разумеючы, гаворыць дзядзька.

— А вы паспрабуйце — на тры часткі... Прыедзеце дамоў і падзяліце.

...Пасажыры смяюцца, мы выходзім, дзядзька едзе і — магчыма — «дзеліць».

Нехта не дурны казаў, што смеху баіцца нават той, хто не баіцца нічога.

**Валянціна ДОЎНАР**
*dounar@zviazda.by*

## АСТРАМЕЧАВА І АСТРАМЕЧАЎЦЫ

### У нашай краіне выходзіць больш за тысячу друкаваных выданняў. «Астрамечаўскі рукапіс» — ці не з самых арыгінальных

**Брэсцкі раённы краязнаўчы альманах, які выдае Брэсцкі райвыканкам, ужо ўваходзіць у пяцігадовую гісторыю сваёй біяграфіі. Усяго пабачыла свет 16 штоквартальных выпускаў гэтага адмысловага масмедыя.**

У новым, чацвёртым за 2016 год, нумары — ранейшыя традыцыйныя рубрыкі «Астрамечава і астрамечаўцы», «Народныя святы і звычаі Берасцейшчыны», «Чароўныя спевы і паданні спадчыны», «Скарбніца народных талентаў», «Літаратурная сядзіба», «Кніжная зала», «Карані», «Свята хрысціянства» і іншыя. Рэдактар і ўкладальнік альманаха пісьменнік Аляксандр Валковіч выбудоўвае прастору выдання такім чынам, што ўсе ці амаль усе матэрыялы маюць дачыненне да Брэсцкага раёна, ваколіц Брэста. Як і ранейшыя выпускі, чацвёрты (а ўвогуле — шаснаццаты) выпуск альманаха прыцягвае шырокай і грунтоўнай распрацоўкай фальклорнай, этнаграфічнай тэм. Як прыклад — артыкул доктара філалагічных навук, прафесара кафедры беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна Іны Швед «Мікола — о, то був святок вялікі!», у якім ідзе размова пра ўшанаванне памяці свяціцеля і цудатворцы Мікалая (Святога Мікалая Цудатворцы, Мікалая Мірлікійскага, Мікалая Угодніка). Аповед дасведчанага вучонага (і, між іншым, навуковага кансультанта выдання) падаецца ўнікальный фальклорнай, краязнаўчай экскурсіяй па розных паселішчах Берасцейшчыны.

Вельмі ўважлівы «Астрамечаўскі рукапіс» да майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, інсітнага, народнага мастацтва. Дарэчы, сярод тых, хто спрыяе выхаду альманаха ў свет, — і Брэсцкі раённы дом рамёстваў.

Варта заўважыць, што сапраўды ўнікальнае выданне, якое працуе на падтрымку народнай культуры, народных традыцый, робіцца зусім невялікімі творчымі сіламі. У большай ступені — на грамадскіх пачатках. І, канешне ж, генератарам, галоўнай творчай, арганізацыйнай сілай у выпуску «Астрамечаўскага рукапісу» выступае згаданы ўжо Аляксандр Валковіч. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар многіх кніг прозы і публіцыстыкі, ён прыкладу нямала намаганняў для развіцця краязнаўчага выдання, аб'яднаў вакол яго самых розных аўтараў. Поруч з Інай Швед кансультантам «Астрамечаўскага рукапісу» выступае доктар філалагічных навук прафесар Адам Мальдзіс. Неаднойчы пра альманах пісалі ў абласным і рэспубліканскім друку.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 13 ФЕВРАЛЯ 2017 ГОДА ТОРГОВ**
**с условиями по продаже недвижимого имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «МИНСКРЕМСТРОЙ»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | «Помещение общественного питания № 1» общей площадью 872,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Харьковская, д. 3А, пом.1 (инв. номер в ЕГРНИ: 500/D-687650; назначение: помещение общественного питания) |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск, телефон (017) 226-41-15 |
| **Сведения об организаторе торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62 |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб.** | 889 574,04 |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 13 февраля 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 12.01.2017 по 09.02.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 200-99-78, (029) 350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).

# ПАМІЖ ДВУМА АКІЯНАМІ

## Ці здолее Нікарагуа выкарыстаць свой гістарычны шанц?



**У Нікарагуа адбылася інаўгурацыя прэзідэнта. Дарэчы, кіраўніка дзяржавы тут выбралі яшчэ 7 лістапада мінулага года. Да ўлады ў самай вялікай па тэрыторыі краіне Цэнтральнай Амерыкі прыйшоў легендарны камандантэ Хасэ Даніэль Артэга Сааведра. Дакладней, палітычны доўгажыхар быў пераабраны на трэці прэзідэнцкі тэрмін, прычым з вялікім адрывам ад канкурэнтаў (Артэгу падтрымалі 72,5 працэнта выбаршчыкаў). Нікарагуа пакуль застаецца ў ліку найбяднейшых тэрыторый макрарэгіёна. Аднак гэтая дзяржава дэманструе значныя тэмпы эканамічнага развіцця, тут у адрозненне ад шэрагу навакольных краін забяспечваецца надзейны грамадскі парадак. Да таго ж распачалася рэалізацыя грандыёзнага інфраструктурнага праекта, які злучыць Ціхі і Атлантычны акіяны. Ці атрымаецца Нікарагуа выкарыстаць свой гістарычны шанц?**



### Ад канкістадораў да авантурыстаў

Атлантычнае ўзбярэжжа Нікарагуа еўрапейцы адкрылі ў 1502 годзе падчас чацвёртага падарожжа Хрыстафора Калумба. Заваёўнік Франсіска Эрнандэс дэ Кардоба (па прозвішчы якога, дарэчы, названая сучасная валюта краіны) заклаў тут першыя іспанскія паселішчы ў 1523-м. З індзейцамі, якія засялялі паўднёва-заходнія тэрыторыі (перашыек паміж возерам Нікарагуа і Ціхаакіянскім узбярэжжам), адным з ацтэкскіх плямёнаў, канкістадоры заключылі дамову. Па імені правадыра (касіка) таго плямені — нікараа — была названая ўся краіна. Аднак на паўночных тэрыторыях іспанцам прыйшлося некалькі гадоў ваяваць з іншымі індзейскімі плямёнамі. У XVI стагоддзі іспанскія канкістадоры заснавалі два гарады: Гранаду — на заходнім беразе возера Нікарагуа, у канцы воднага шляху з Атлантыкі, і Леон — паблізу ціхаакіянскага ўзбярэжжа. Значная частка індзейскага насельніцтва была знішчана або вымерла ад завезеных іспанцамі захворванняў. Астатнія пачалі змешвацца з іспанскімі пасяленцамі. У Нікарагуа канкістадоры не знайшлі буйных радовішчаў золата і серабра, таму Гранада і Леон сталі аграрнымі калоніямі Іспаніі. З канца XVI стагоддзя для працы на плантацыях (дзе вырошчваліся індыга, цукровы трыснёг і какава) пачалі завозіць неграў-рабоў з Афрыкі, але гэтая рабочая сіла выкарыстоўвалася ў Нікарагуа ў параўнальна невялікай колькасці.

З 1570 па 1821 год Нікарагуа — у складзе іспанскага генерал-капітанства Гватэмала. Тэрыторыя была падзелена паміж памешчыкамі-латыфундыстамі. Усходняя частка краіны — Бераг Маскітаў, з нездаровым кліматам і глухімі лясамі — іспанцамі не каланізавалася. Там атабарыліся англійскія піраты, якія «палявалі» на іспанскія караблі. Замацаваўшыся на ўсходнім узбярэжжы, англічане з XVII стагоддзя здзяйснялі рэйды на захад Нікарагуа па рацэ Сан-Хуан і нападалі на іспанскія калоніі. У той перыяд насельніцтва Берага Маскітаў папаўнялася ў асноўным за кошт неграў, бежанцаў з англійскіх калоній. Імкнучыся ўмацаваць тут свае пазіцыі, англічане арганізавалі выбары негрыцянскага караля. У выніку яны захоўвалі кантроль над Берагам маскітаў аж да сярэдзіны XIX стагоддзя, калі былі вымушаныя сысці адтуль пад націскам ЗША, якія планавалі тады пракапаць на тэрыторыі Нікарагуа канал, які злучае Атлантычны і Ціхі акіяны.

У 1821-м, падчас вайны за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы, тэрыторыя Нікарагуа ўваходзіла ў склад Мексіканскай імперыі, крыху пазней — Злучаных правінцый Цэнтральнай Амерыкі. У 1838-м краіна атрымала незалежнасць. Праўда, незалежная Нікарагуа перажыла працяглы перыяд нестабільнасці і гвалту з-за саперніцтва паміж кансерватарамі, што заселі ў Гранадзе, і лібераламі, якія займалі Леон. З сярэдзіны XIX стагоддзя за пераважны ўплыў у Нікарагуа (у асноўным з мэтай пабудовы на яе тэрыторыі міжакіянскага канала) разгарнулася барацьба паміж ЗША і Вялікабрытаніяй.

Мабыць, найбольшы шок мясцовыя палітыкі перажылі, калі ў 1855 годзе авантурыст з Тэнэсі Уолтар Уолкер заваяваў Нікарагуа са сваёй невялікай наёмнай арміяй. «Фаланга Бессмяротных» колькасцю ўсяго 58 чалавек здолела захапіць краіну, і Уолкер абвясціў сябе прэзідэнтам Нікарагуа. Але суседнія дзяржавы пайшлі на яго вайною, і авантурысту давялося бегчы з краіны ўжо ў 1857 годзе.



Кансерватары і лібералы дамовіліся, што Манагуа стане адзінай нейтральнай і пастаяннай сталіцай дзяржавы. Затым кансерватары захапілі ўладу на трыццаць гадоў, на працягу якіх пераследавалі лібералаў і ўсяляк заахвочвалі замежныя інвестыцыі. Лібералы вярнуліся да ўлады ў 1893 годзе ў выніку перавароту і неўзабаве сталі ў апазіцыю да Злучаных Штатаў.

### Спадчына Сандына

Кансерватары вярнулі сабе ўладу ў 1910 годзе, калі ЗША адмовіліся прызнаць новага ліберальнага кандыдата ў прэзідэнты. Дэсант у складзе ўсяго сотні марскіх пехацінцаў дапамог кансерватарам утрымаць уладу. Затым у краіну прыбылі яшчэ войскі Штатаў і заставаліся на працягу 1912-га, калі прайшлі праамерыканскія выбары, у выніку якіх пры ўладзе застаўся іх стаўленік — кансерватар. У той час ЗША вавалі адразу ў некалькіх краінах Цэнтральнай Амерыкі і Карыбскага басейна — гэтыя канфлікты за ўплыў у рэгіёне атрымалі агульную назву «бананавых войнаў». «Бананавыя войны» скончыліся Вялікай дэпрэсіяй і абраннем прэзідэнтам ЗША дэмакрата Франкліна Рузвельта, які кардынальна змяніў курс знешняй палітыкі, накіраваўшы яго ў рэчышча так званай палітыкі добрасуседства. Калі амерыканскія войскі былі канчаткова выведзены з Нікарагуа ў 1925 годзе, там адразу ўспыхнула грамадзянская вайна. Прэзідэнт ЗША Кельвін Кулідж сутыкнуўся з тым, што многія палітыкі не хочуць вяртання ў Нікарагуа амерыканскіх марскіх пехацінцаў, таму была запушчана ідэя «камуністычнай пагрозы». Кулідж паслаў Генры Сімпсана ў Нікарагуа, каб той паспрабаваў прымірыць ваюючыя бакі.

Адзін з ліберальных лідараў, харызматычны генерал Аўгуста Сезар Сандзіна, не пажадаў скласці зброю да поўнага сыходу амерыканцаў з краіны і працягваў партызанскую вайну-герылью. Шэсць гадоў крывавага супрацьстаяння нічога не далі, затое ваенна-марскія сілы ЗША ўпершыню ў ваеннай гісторыі здолелі ўжыць авіяцыйныя глыбакаводныя бомбы. Калі амерыканцы нарэшце пакінулі Нікарагуа, Сандзіна спыніў баявыя дзеянні, але ў выніку быў схоплены Нацыянальнай гвардыяй — унутранай праамерыканскай арганізацыяй — падчас перамоў аб дэмабілізацыі арміі сваіх прыхільнікаў, а затым і расстраляны. Праз трыццаць гадоў імем генерала быў названы фронт нацыянальнага вызвалення краіны.

У 1936 годзе да ўлады ў Нікарагуа прыйшоў лідар Нацыянальнай гвардыі, дыктатар Анастасіа Самоса Гарсія. Лічыцца, што менавіта пра яго ў свой час Рузвельт сказаў: «Можа, ён і сукін сын, але гэта наш сукін сын». Самоса на некалькі дзесяцігоддзяў усталяваў у Нікарагуа аўтарытарны рэжым, дзе ўрадавая гвардыя стала прывілеяванай кастай, фактычна арганізаванай злачыннай групоўкай нацыянальнага маштабу і з дзяржаўным мандатам. Гвардыя кантралявала наркатрафік, была «дахам» арганізаванай прастытуцыі, ігральнага бізнесу, гандлю медыкаментамі. Самоса дайшоў да вяршыні ўлады ў 1937 годзе і неўзабаве стаў самым багатым чалавекам у Цэнтральнай Амерыцы. Пры гэтым дыктатар і яго прыхільнікі кіравалі краінай, абапіраючыся на амерыканскую ваенную і эканамічную дапамогу. Так было аж да 1979 года — так званай сандзіністкай рэвалюцыі, калі ўлада перайшла ў рукі сандзіністкага фронту нацыянальнага вызвалення (СФНВ) — левардыкальнага руху, арыентаванага на супрацоўніцтва з СССР і Кітаем.

У 1984-м адбыліся ўсеагульныя выбары, на якіх перамог Даніэль Артэга. Гэта чалавек насамрэч гістарычнага маштабу, які яшчэ з пачатку 1960-х адыгрываў вялікую ролю ў палітычным жыцці сваёй краіны. Артэга быў упершыню затрыманы за рэвалюцыйную дзейнасць у 1960-м, калі яму было ўсяго 15 гадоў. Праз два гады будучы прэзідэнт уступіў у сандзіністкі фронт нацыянальнага вызвалення.

У 1990 годзе сандзіністы не змаглі ўтрымаць уладу: Фронт атрымаў толькі 41% галасоў, а апазіцыя — 55%. Да ўлады прыйшлі больш памяркоўныя ў поглядах сілы на чале з Віялетай Чамора (у 1978-м яна змяніла свайго забітага мужа ў якасці цэнтральнай фігуры на ліберальным флангу). Артэга апынуўся ў апазіцыі, вярнуць уладу яму ўдалося толькі праз 16 гадоў — у 2006-м.

### «Дублёр» за $50 млрд

Партыя Артэгі змяніла рыторыку з сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі на захаванне традыцыйных каштоўнасцяў. Прэзідэнту Нікарагуа ўдалося наладзіць канструктыўныя стасункі з прадпрымальніцкім сектарам і нармалізаваць адносіны з каталіцкай царквой. Даніэль Артэга здолеў значна палепшыць эканамічнае становішча краіны (хоць Нікарагуа і з'яўляецца па-ранейшаму адной з самых бедных краін Цэнтральнай і Лацінскай Амерыкі) і, што не менш важна, вывесці адукацыю на якасна новы ўзровень.

Адным з галоўных і найбуйнейшым за ўсю гісторыю краіны праектаў сусветнага маштабу, ідэю якога нікарагуанцы песцяць яшчэ з XVIII стагоддзя і які мае намер рэалізаваць Даніэль Артэга, з'яўляецца будаўніцтва Нікарагуанскага канала — патэнцыйнай канкурэнтнай альтэрнатывы Панамскаму каналу. «Вялікі трансканцінентальны канал Нікарагуа», названы ў праставамоўі Нікарагуанскім каналам, мае ўсе шанцы стаць будоўляй стагоддзя. Пачатак яго эксплуатацыі намечаны на 2019-ты, а поўнае завяршэнне будаўніцтва — на 2029-ты. Па прыблізных падліках, за год «дублёр» зможа прапускаць каля 5 тыс. суднаў — каля 5% ад сусветнага марскога трафіка. Пры гэтым асноўным фундаматарам выступае HKND-Group, прыватная транснацыянальная кампанія са штабкватэрай у Ганконгу.

Даніэль Артэга заявіў, што пракладка канала дасць краіне вялікую колькасць новых працоўных месцаў і будзе спрыяць паляпшэнню эканамічнага становішча. Чакаецца, што ў рэалізацыі праекта агульным коштам каля 50 мільярдаў долараў прымуць удзел больш за 50 тысяч чалавек. Акрамя самога канала, плануецца пабудаваць некалькі партоў, міжнародны аэрапорт і стварыць зону свабоднага гандлю. Па папярэдніх разліках, канал будзе глыбейшым, шырэйшым і даўжэйшым, чым Панамскі, і дазволіць прапускаць судны ўдвая большага танажу (у тым ліку звышцяжкага класа — грузападымальнасцю да 400 тысяч тон). Заяўленыя параметры: да 30 метраў глыбіні, да 530 метраў шырыні і 278 кіламетраў даўжыні, з якіх 105 км — па возеры Нікарагуа.

Рэалізацыя праекта ў Нікарагуа выклікае пратэсты ў мясцовых эколагаў, якія заяўляюць пра вялікі ўрон для навакольнага асяроддзя. У прыватнасці гаворка ідзе аб магчымым забруджванні возера Нікарагуа — найбуйнейшага рэзервуара прэснай вады ў Цэнтральнай Амерыцы. Мясцовыя жыхары пратэстуюць супраць магчымага адчужэння іх зямлі. Чакаецца, што свае тэрыторыі прыйдзецца пакінуць 30 тысячам фермераў. Праўда, Даніэль Артэга дакладна заявіў: усім будзе выплачана належная кампенсацыя.

Крытыкі заяўляюць, што пакуль невядома, ці будзе Нікарагуанскі канал мець эканамічную выгаду. Як піша Financial Times, з'явіліся сумненні наконт таго, што гэты грандыёзны праект калі-небудзь удасца ажыццявіць. Сярод падстаў для такіх асцярог эксперты называюць шэраг важкіх абставін. У іх ліку — тэрытарыяльныя прэтэнзіі з боку Коста-Рыкі, праведзенае пашырэнне і мадэрнізацыя Панамскага канала, а таксама ці не самае галоўнае — астранамічны кошт праекта (прыцягнуць адпаведныя фінансавыя рэсурсы вельмі складана, а для беднай краіны такі бюджэт увогуле непад'ёмны).

Спачатку чакалася, што канал будзе цалкам уведзены ў эксплуатацыю ў 2019 годзе. Але рэалізацыя праекта новага воднага шляху ў Нікарагуа адкладзена на няпэўны тэрмін. Будоўля замарожана восенню 2015 года з прычыны адсутнасці фінансавання. Як заявіў прэс-сакратар камісіі па будаўніцтве Нікарагуанскага канала Тэлемака Талавера, рэалізацыя праекта «амаль рэальнасць». Але даты старту пакуль невядомыя, і зараз на парадку дня стаіць задача «ўдакладніць шэраг геалагічных, картаграфічных і інжынерных праектаў», звязаных з будаўніцтвам. Акрамя гэтага, «укараняецца план па аднаўленні біяразнастайнасці на навуковай аснове і з канкрэтнымі дзеяннямі». Пакуль што скончана даследаванне глеб тэрыторыі, якая ахопліве 4550 квадратных кіламетраў, паведамляе Prensa Latina. Рэалізацыя мегапраекта так і не прасунулася істотна з моманту пачатку работ па стварэнні першай інфраструктуры. Так і не былі пабудаваны міжнародны аэрапорт, два глыбакаводныя парты, склады і фабрыкі будаўнічых матэрыялаў.

Калі Артэга сапраўды хоча рэалізаваць план, яму варта паспяшацца: суседзі не дрэмлюць. Гандурас заканчвае дарогу, якая злучае ўзбярэжжа Атлантыкі і Ціхага акіяна. Коста-Рыка таксама абвясціла аб будаўніцтве 10-палоснага «сухога канала» (кашторыс будаўніцтва гэтай шашы — 16 мільярдаў еўра), які будзе канкураваць з Панамскім «мокрым». Таму ўнікальны гістарычны шанц для Нікарагуа можа так і застацца прыгожай марай.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
06.01.2016 г.
Сушко С.А.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ Общества с ограниченной ответственностью «ЛОДЭ» первого выпуска

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента**
На русском языке:
полное — Общество с ограниченной ответственностью «ЛОДЭ» (далее – Эмитент);
сокращенное — ООО «ЛОДЭ».
На белорусском языке:
полное — Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЛОДЭ»;
сокращенное — ТАА «ЛОДЭ».

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail), официальный сайт**
Республика Беларусь, 220005, г. Минск, ул. Гикало, д.1, пом.10,тел./факс 80173313160, e-mail: secret@lode.by, официальный сайт: www.lode.by. (далее –сайт Эмитента)

**3. Основные виды деятельности**
специализированная врачебная практика;
стоматологическая деятельность

**4. Номера расчетного и (или) валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование банка**
Денежные средства, поступающие при размещении облигаций Эмитента первого выпуска, будут зачисляться в соответствии с законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на расчетный счет Эмитента № 3012150214023 (в долларах США) в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №700 по г. Минску и Минской области, код 369.

**5. Раскрытие информации эмитентом**
Эмитент в случаях и порядке, установленным законодательством Республики Беларусь, раскрывает информацию на рынке ценных бумаг:
путем ее размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Единый информационный ресурс);
а также путем ее опубликования в газете «Звязда» и (или) размещения на сайте Эмитента, указанном в пункте 2 настоящего документа;
либо путем ее доведения до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным Республики Беларусь, а также путем ее предоставления в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, определенному кругу лиц.
5.1. Эмитент раскрывает информацию о своей реорганизации, а также о реорганизации своих дочерних и зависимых хозяйственных обществ (при их наличии), в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на Едином информационном ресурсе.
Информация о реорганизации раскрывается не позднее 2 (двух) рабочих дней:
с даты принятия соответствующего решения общим собранием участников Эмитента;
с даты государственной регистрации организации, созданной в результате реорганизации; даты внесения в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращении деятельности присоединенной организации.
5.2. Эмитент раскрывает информацию о своей ликвидации, а также о ликвидации своих дочерних и зависимых хозяйственных обществ (при их наличии), в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на Едином информационном ресурсе.
Информация о ликвидации раскрывается не позднее 2 (двух) рабочих дней с даты принятия соответствующего решения общим собранием участников Эмитента.
Также, в случае принятия Эмитентом решения о ликвидации (прекращении деятельности), сведения о том, что Эмитент находится в процессе ликвидации (прекращения деятельности) подлежат размещению в глобальной компьютерной сети Интернет на официальном сайте юридического научно-практического журнала «Юстиция Беларуси» (www.justbel.info) в порядке, определенном Инструкцией о порядке размещения и опубликования сведений о нахождении юридического лица (индивидуального предпринимателя) в процессе ликвидации (прекращения деятельности), утвержденной постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 31.08.2011 №1164, не позднее 30 (Тридцати) календарных дней от даты принятия соответствующего решения уполномоченным органом Эмитента.
5.3. Эмитент раскрывает информацию о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на Едином информационном ресурсе.
Информация о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) раскрывается не позднее 2 (двух) рабочих дней с даты получения Эмитентом копии заявления в экономический суд о банкротстве Эмитента.
Также вышеуказанная информация подлежит публикации в журнале «Судебный вестник Плюс: Экономическое правосудие» в течение 5 (Пяти) календарных дней с момента получения соответствующего судебного постановления.
5.4. Эмитент раскрывает информацию об изменениях и (или) дополнениях, внесенных в Проспект эмиссии Облигаций Эмитента первого выпуска, путем ее размещения на Едином информационном ресурсе, а также путем опубликования в газете "Звязда" не позднее 7 (семи) дней после их регистрации республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг.
5.5. Эмитент раскрывает в соответствии с законодательством Республики Беларусь иную информацию о существенных фактах (событиях, действиях), касающихся его финансово-хозяйственной деятельности, которые могут повлиять на стоимость Облигаций, в порядке и сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.
5.6. Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает годовой отчет путем размещения соответствующей информации в объеме, определенном законодательством, на Едином информационном ресурсе, а также путем опубликования в газете «Звязда» либо путем размещения на сайте Эмитента, указанном в пункте 2 настоящего документа, в срок не позднее одного месяца после утверждения годового отчета в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь о хозяйственных обществах.
Иная информация Эмитента раскрывается в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**
Общество с ограниченной ответственностью «Промреестр» (далее – депозитарий), зарегистрированный Минским горисполкомом 29.06.2001 за №101275094, код депозитария – D23.
Место нахождения депозитария: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, д.16, к.608.
Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-124-1123 выдано Министерством финансов Республики Беларусь, действительно до 01.08.2022.

**7. Размер уставного фонда эмитента**
Уставный фонд Эмитента составляет 10 800 000 (десять миллионов восемьсот тысяч) белорусских рублей (без учета деноминации 1 июля 2016 г., в денежных знаках образца 2000 г.) или 1 080 (одна тысяча восемьдесят) белорусских рублей (с учетом деноминации 1 июля 2016 г., в денежных знаках образца 2009 г.)

**8. Форма облигаций, объем выпуска, количество и номинальная стоимость облигаций**
Облигации первого выпуска – именные, процентные, конвертируемые, бездокументарные (далее – Облигации).
Объем выпуска Облигаций – 500 000 (Пятьсот тысяч) долларов США.
Количество Облигаций – 5 000 (Пять тысяч) штук.
Номинальная стоимость Облигации – 100 (Сто) долларов США.

**9. Срок размещения облигаций** – с 27.01.2017 по 19.01.2018, если иной срок до окончания периода размещения не будет определен решением общего собрания участников Эмитента.

**10. Порядок размещения облигаций. Место проведения открытой продажи облигаций**
Размещение (открытая продажа) Облигаций осуществляется на организованном рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа) в соответствии с законодательством Республики Беларусь и нормативно-правовыми актами Биржи. Расчеты при размещении Облигаций на организованном рынке производятся в соответствии с регламентом расчетов Биржи.
Владельцами Облигаций могут быть физические и юридические лица (включая банки), индивидуальные предприниматели, резиденты и нерезиденты Республики Беларусь.
В период размещения Облигации продаются первому их собственнику по цене, равной номинальной стоимости Облигации, увеличенной на сумму накопленного процентного дохода (по текущей стоимости Облигации). В дату начала открытой продажи Облигаций, а также в даты выплаты процентного дохода цена продажи одной Облигации равна её номинальной стоимости.

**11. Срок обращения облигаций**
Срок обращения Облигаций – 364 календарных дня (с 27.01.2017 по 26.01.2018). Дата начала размещения и дата начала обращения Облигаций считаются одним днем.

**12. Дата начала погашения облигаций – 26.01.2018. Дата окончания погашения** Облигаций совпадает с датой начала погашения Облигаций.

**13. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций**
Для целей погашения Облигаций депозитарий Эмитента формирует реестр владельцев Облигаций по состоянию на 23.01.2018.

**14.Размер дохода по облигациям, условия его выплаты.**
Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинальную стоимость Облигации за период начисления процентного дохода по ставке процентного дохода, равной **8,0 (Восьми) процентам годовых.**
Выплата процентного дохода владельцам Облигаций производится ежеквартально в течение срока обращения Облигаций в соответствии с Графиком начисления и выплаты процентного дохода.

**15. Даты выплаты периодически выплачиваемого процентного дохода. Даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода.**
Процентный доход выплачивается в дату окончания соответствующего периода начисления процентного дохода:
График начисления и выплаты процентного дохода

| Номер периода | Начало периода начисления процентного дохода | Конец периода (дата выплаты процентного дохода/ дата погашения) | Продолжительность периода, дней | Дата формирования реестра для целей выплаты процентного дохода либо погашения |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 28.01.2017 | 27.04.2017 | 90 | 20.04.2017 |
| 2 | 28.04.2017 | 27.07.2017 | 91 | 24.07.2017 |
| 3 | 28.07.2017 | 27.10.2017 | 92 | 24.10.2017 |
| 4 | 28.10.2017 | 26.01.2018 | 91 | 23.01.2018 |
| Итого: | | | 364 | |

В случае если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, фактическая выплата осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму процентного дохода по Облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящем документе установленные и объявленные Президентом Республики Беларусь нерабочими днями.

**16. Условия приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения**
В период обращения Облигаций Эмитент, начиная с 06.02.2017, вправе осуществлять приобретение Облигаций до даты начала их погашения с возможностью их последующего обращения (далее – досрочный выкуп Облигаций) по текущей стоимости Облигаций у любого их владельца на организованном рынке.

**17. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**
С Проспектом эмиссии Облигаций можно ознакомиться в период открытой продажи Облигаций по адресу: Республика Беларусь, 220005, г. Минск, ул. Гикало, д.1, пом.10, в рабочие дни с 9.00 до 16.00.
При обращении к Эмитенту с целью ознакомления с Проспектом эмиссии Облигаций потенциальному инвестору (инвестору) представляется Проспект эмиссии Облигаций и/или заверенная копия Проспекта эмиссии Облигаций для обозрения (чтения) с возможностью делать выписки из представленного документа.

Директор ООО «ЛОДЭ» Горбачев В.В.
Главный бухгалтер ООО «ЛОДЭ» Дубовик С.Н.

---

**ОТДЕЛ ПРИНУДИТЕЛЬНОГО ИСПОЛНЕНИЯ УПРАВЛЕНИЯ ПРИНУДИТЕЛЬНОГО ИСПОЛНЕНИЯ ГЛАВНОГО УПРАВЛЕНИЯ ЮСТИЦИИ МИНГОРИСПОЛКОМА**
**объявляет о проведении повторных публичных торгов в рамках исполнительных производств**

## о взыскании задолженности с Демчука Сергея Всеволодовича

**ЛОТ №1. Объект недвижимости (недвижимое улучшение: капитальное строение (жилой дом) с инвентарным номером 614/С-770 и земельный участок с кадастровым номером 624885003601000003, расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, д. Ляды, 37А.**

**Стоимость – 947 281 белорусский рубль 50 копеек.**

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте:
**http://just-minsk.gov.by/,**
а также в помещении отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома: г. Минск, ул. Коллекторная, 3.

**Торги состоятся 31.01.2017 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3, каб. 204.**

**По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться:**
**судебный исполнитель Русецкий Алексей Павлович,**
**т./ф. (017) 200-12-93, +375-44-529-25-11**
**начальник отдела Шмарловская Ирина Владимировна,**
**тел.: 200-13-48, +375-44-529-25-01**
**с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00**
**или по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900002445 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 100223493 отдела принудительного исполнения УПИ ГУЮ Мингорисполкома не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

---

УНП 800010228

**Общее собрание кредиторов**
**иностранного унитарного предприятия**
**«ИЗОБУДПРОМСТРОЙ»**
**по вопросу защиты требования Минского отдела Департамента охраны МВД Республики Беларусь состоится 23.01.2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 101, оф. 1, каб. 1.**

Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями можно по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 101, оф. 1, каб. 1, согласовав время с представителем управляющего по тел. 8-017-388-03-25.
Более подробная информация имеется на сайте: **http://bankrot.gov.by**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** Дубровенское районное потребительское общество, г.Дубровно, ул.Фабричный двор, 8, тел. (02137) 43737.

Лот №1. Капитальное строение с инв.№241/С-6829 площадью 253 кв.м, наименование – столовая-кафе по адресу: Витебская обл., Дубровенский р-н, г.Дубровно, ул.Комсомольская, 8А, капитальное строение с инв.№241/С-6830 площадью 387 кв.м., наименование – склад по адресу: Витебская обл., Дубровенский р-н, г.Дубровно, ул.Комсомольская, 8А/1 на зем.участке №222450100002000040 площадью 0,2325 га. **Нач.цена:** 270 261,68 руб. с НДС. **Задаток:** 27 026,17 руб.

